Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 31 (2881) Год LVI | Беласток, 31 ліпеня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (у тым VAT 5%)

ГІСТОРЫЯ СШЫТАЯ БЕЛАРУСКАЙ НІТКАЙ?

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

18 чэрвеня 1961 года. Пачатак канікулаў. Будучы сусветнай вядомасці дырыжор Ежы Максымюк завітаў на момант у Беласток, каб пабачыцца з матуляй. За некалькі дзён падасца ён у Польшчу, каб падзарабіць ў курортах ігрой для летнікаў. За парогам заспела яго звестка: памёр Ян Тарасевіч. Развярнуўшыся на пяце, адразу паляціць у дом прыяцеля. Яго следам прыляціць аж з квартала Баяры матуля з абедам у гаршку, падкарміць сына з дарогі. Паабедаюць у агародзе, ля драўлянага домика па вуліцы Бэма, 12. Той абед, прыпраўлены слязой, запамятаецца на ўсё жыццё. Ён будзе смакаваць быццам згатаваў яго сам прафесар. Пасля будучы дырыжор адправіць маці дамоў. Сам застанецца пры нябожчыку і ўсю ноч будзе размаўляць з ім як з жывым, іграць яму Рахманінава, Бетховена, Ліста...

Тады зразумее, якую творчую сілу нясе боль расстання з любімым чалавекам.

* * *

Дзень смерці запамятае Збігнеў Папельскі, кампазітар і педагог з Беластока:

— Пра смерць пана Тарасевіча я хіба даведаўся ў Варшаве ад Тэрэзы Казакевіч. Гэта зышлося з пачаткам канікул. Мы ўсе адным цягніком прыехалі ў Беласток. На месцы высветлілася вялікая праблема. Як даставіць нябожчыка ў Саколку? І тады мы згодна рашылі: мусова выканаць апошнюю волю пана Тарасевіча. З перспектывы Варшавы яго заслугі і роля здаваліся неасцрэчнымі.

Збігнеў Папельскі не памятае ўжо як дабіраліся на вакзал. Найхутчэй дамавіну з целам кампазітара занеслі на сваіх плячах. Што ж гэта было для чатырох маладых хлапцоў — музыкантаў! Пасля ўсе як адзін муж, разам з нябожчыкам, адправіліся чыгункай у Саколку. І зноў занясуць дамавіну з целам, на плячах, у капліцу.

— Вам дазволілі падарожнічаць з мёртвым чалавекам у труне? — пытаю.

— У той час наш учынак не выклікаў здзіўлення, — кажа спакойна Збігнеў Папельскі.

Больш за самую дарогу Збігнеў Папельскі запамятаў момант, калі ў час пахавання раскрылася труна. Людзі гаварылі: *Пан прафесар не хоча развітацца з вучнямі.*

* * *

У апошнюю ноч, да рання, сядзелі з ім яго вучні-ліцэісты: Юрка Максымюк, Міраслаў Кулікоўскі, Збігнеў Папельскі і Тэрэза Казакевіч (Адамчык). Завадатарам усёй ініцыятывы быў Анатоль Чарапінскі. Тэрэза Казакевіч, прафесар Варшаўскай кансерваторыі, запамятала адно вялікае пачуццё крыўды. Яна не патрапіла змірыцца з той абыякавасцю „беластока", якая праігнаравала смерць музыканта. Столькі ж народу ён вывеў у людзі. Запамятала таксама страх, калі ноччу адны сядзелі ля труны на могілках: *Żal ściskał serce.* Прафесар Тэрэзы Казакевіч няма ўжо ў жывых. Таксама няма ў жывых доктара Анатоля Чарапінскага — чалавека, які захаваў спадчыну кампазітара і перадаў яе ў Беларусь. Пра дзень смерці свайго ментара і апекуна гаварыў як пра паслядоўнасць чарговага інсульту. Аб канчыне прафесара наказала яму сям'я Кулікоўскіх. Сам прадчуваў благое. Апошні ліст, які атрымаў тры дні да смерці, выглядаў як сапраўднае развітанне. У ім было столькі чуласці, надзеі і веры ў будучыню вучня. Едучы з Любліна ў Беласток, Чарапінскі думаў пра празорлівасць у шындзельскай сям'і Тарасевіча. Вось, смерць Нічыпара Улазоўскага, прыёмнага бацькі музыканта, абрасла ў легенду. Тры дні да сваёй смерці ён склікаў суседзяў і наладзіў ім баль. У аўторак вечарам загадаў ехаць свайму парабку ў Саколку па дамавіну. Памёр, як прадбачыў, у тую сераду, на золку. Анатоль Чарапінскі не ведае якім цудам давезці цела прафесара ў Саколку і пахаваць яго, згодна з апошняй воляй, побач дзядзькі Нічыпара. Часта паўтараў, што сам Тарасевіч „запланаваў" сваю смерць летам, калі яго маладых сяброў адпусцяць са школьнай парты і калі яшчэ не раз'едуцца на канікулы па ўсіх кутках Польшчы. Бо як не круці, да той труны патрэбных было чатырох чалавек.

* * *

18 чэрвеня 2011 года. На могільніку ў Саколцы прыхадское свята ў гонар мучаніцы дзевы Паўлы. Свята прымеркаванае да троіцкіх Дзядоў.

— Калі ён сам хацеў быць пахаваны ў Саколцы, — кажа айцец Удадзімір Місеюк, — тут мусіла быць для яго штосьці добрага.

Пасля літургіі і хрэснага ходу ўся грамада парафіян, якія з'ехаліся на свята, наблізілася да магілы музыканта, каб саслужыць яму асобную паніхіду. Настаяцель з памяці прачытаў імёны родных кампазітара, не пакідаючы ні адной асобы з сям'і. Апошняя інфармацыя мае сваю цану. Трэба было гадоў, каб саставіць той спісак сям'і кампазітара, рассыпанай па шырокім свеце ды пахаванай у прызабытых магілах. Сёння іх памяць прызываюць у Саколцы!

Мяне моцна ўзрушыў вянок ад ліцэістаў і настаўнікаў з Саколкі, якія некалькі гадоў таму ўдзельнічалі ў польска-беларускім праекце ды ставілі спектакль „На крыллях музыкі".

Знаёмая харыстка распавяла як разам з мужам, царкоўным старастам, прыбіралі пад свята магілу. А траву, пра што не забылася напамянуць мая субяседніца, уласнаручна скасіў сам бацюшка (айцец Юстын). Бо ж парасла ўжо як лес.

— Мы ўсё думаем, што спадчына гэта матэрыяльнае багацце, а той духовай спадчыны, бывае, і не бачым, не прымаем, — гаварыў айцец Уладзімір.

— А духоўная спадчына, нават, калі мы яе спачатку не хочам, не прымаем, вяртаецца на сваё месца. І мы тады самі разумеем, што гэта дар Божы. Такі дар пакінуў нам Ян Тарасевіч, таму мы, звычайныя людзі, вінаватыя яму памяць.

Два тыдні пасля, 2 ліпеня г.г., памяць пра кампазітара падыме на належнае месца аб'яднанне „Сакольшчына". У пяцідзесятую гадавіну смерці кампазітару, педагогу і піяністу з Саколкі адкрыюць мемарыяльную дошку. Падзея выкліча бурлівую, поўную нацыянальнай зайздрасці спрэчку, якая цягам некалькіх дзён будзе весціся на сакольскіх інтэрнэтных форумах. У яе цэнтры, як не цікава, беларуская мова, і мая сціплая асоба, якую будуць абвінавачваць у тым, што „сшыла цэлую гісторыю беларускімі ніткамі". Сам Тарасевіч жартаваў, калі фанатыкі пыталі яго пра нацыянальнасць. Ён гаварыў ім: „Я не камуніст, я раяліст!"

Цягнік у мінулае

Паездка за мяжу пачынаецца з купляння квітка. Я так і зрабіў. Дакладней, паспрабаваў так зрабіць. І за дзень да выезду звярнуўся ў аўтобусную касу. Якой дрымучай савецкай мінуўшчынай дыхнулі на мяне словы касіркі, што квіткоў няма.

Як гэта няма?! Пасля развалу савецкай імперыі мы ўжо прывыклі, што не можа быць нечага такога, чаго няма. Гэта тады, пад прыгожыя байкі генеральных сакратароў ЦК КПСС пра наша самае шчаслівае савецкае жыццё, мы ведалі, што ў крамах, касах, і паўсюдна пад гэтым небам нам нічога няма. Няма доктарскай каўбасы, няма неабходных лекаў, няма прыгожага абутку, няма легкавых аўтамабіляў, няма аніякіх аўтамабіляў, няма квіткоў на аўтобусы, няма нам месца пад сонцам.

Але як толькі крыху прыадчынілася акенца ў Еўропу, і людзі паспрабавалі трошкі свабоды, адразу ўсё з'явілася. Дэфіцыт кануў у мінулае. І, здавалася, назаўсёды, як і тая савецкая імперыя. Свабодны чалавек робіць свабодны бізнес, і вялікі матэрыяльны дабрабыт. Крыху свабодны чалавек, робіць трошкі свабодны бізнес і невялічкі дабрабыт. Невялічкі дабрабыт зрабіць удалося адносна хутка і, здавалася, будзе расці свабода і адпаведна ўмовы жыцця.

Але не туды тое. Прыйшла новая ўлада і загаварыла пра ўнікальную беларускую мадэль развіцця, якая, праўдападобна, мусіла мець вялікія аналогіі з той мінулай і абрыдлай усім і кожнаму савецкай сістэмай. Папраўдзе кажучы, тыя словы пра постсавецкі эканамічны цуд нават у палітычных колах апазіцыі тады не ўспрынялі ўсур'ёз. Казалі, што ніхто не пацягне краіну назад у багну. Лічылі тыя выказванні проста папулізмам, і гульнёй на савецкаўспамінных пачуццях нейкай часткі народу, якая настальгуючы па сваёй маладосці атаясамлівае яе з палітычнай і эканамічнай сістэмай той краіны.

Ды вось, сталася. І я ўжо іду на чыгуначны вакзал. Там дызель. Можна ехаць стоячы, як у савецкія часы. Яшчэ зусім нядаўна месцаў хапала сядзячых. Але ж мы рухаемся ў мінулае. І па законах жанру ўсё мусіць паўтарыцца ў выглядзе абсурду.

Савецкае мінулае сустрэла адразу. На мытні правяралі ўсіх. Яшчэ нядаўна было як у цывілізаваным свеце. Глядзелі толькі падазроных. А зараз усіх. І пытаюць ці вязеш цыгарэты?

— А што, нельга? — перапытваю.

Кажуць нельга.

— А як буду ехаць назад, — дапытваюся я, — ці можна будзе адтуль прывалачы пабольш „Мальбары"?

Зноў кажуць нельга. А чаму, пытаюся. І вывозіць нельга, і прывозіць нельга. Дзе логіка? Нешта адно мусіць быць карысным для краіны. Ці тое, ці другое. Калі не хапае цыгарэт, то трэба прывозіць. Калі зашмат, то выгадна вывозіць. А тут проста нельга. Нічога нельга. Як тады.

А тут яшчэ тры супрацоўнікі міліцыі прыйшлі. Стаяць і з неахвотай сочаць за працай мытнікаў. Як быццам бы тыя не ведаюць і без іх, што ім рабіць. А хто тады сочыць за парадкам на вакзале? І прычым тут міліцыя да мытні? А пасля памежнікі хадзілі па ўсім цягніку і без энтузіязму, але мусілі выглядаць усю дарогу, ажно да мяжы, ці хто не хавае цыгарэты. А яшчэ зусім нядаўна яны з гонарам займаліся выключна сваімі абавязкамі.

Едучы назад я зноў іх убачыў. Яны сустрэлі суайчыннікаў і гасцей краіны зноў на мяжы. Агляд пашпартоў на прыналежнасць да грамадзянства пачаўся яшчэ ў цягніку. Пасля агляд на мытні, цяпер ужо ці не прывёз чаго лішняга. А вось і начная прывакзальная плошча.

— Колькі будзе даехаць да Дзевятоўкі? — пытаюся ў таксіста.

Той паглядзеў на мае торбы, паціснуў плячамі, падумаў. Ці зрабіў выгляд, што падумаў.

— Ды я збіраўся ўжо дахаты ехаць, — адказаў.

Адказаў так няўпэўнена, чакаючы, што я пачну прасіцца, як у бальшавіцкія часы, каб ён злітасцівіўся і падвёз мяне. За двайную плату, зразумела. Хутка ж ён зарыентаваўся, што мы прыехалі ў мінулае і як там трэба сябе паводзіць. Вось толькі як яшчэ доўга, і наколькі далёка мы туды будзем ехаць? Туды ж нікому не хочацца, і нікому не трэба. Ні мне, ні касірцы, ні мытніку, ні міліцыянту, ні памежніку, ні таксісту...

Віктар САЗОНАЎ

Амерыканскі хлеб

Кожная праца — як сухі хлеб, які цяжка ўкусіць, а яшчэ цяжэй зжаваць, ды калі яго ўжо праглынеш, дык ты — ужо жывеш! Горш, калі не хопіць зубоў. Тады нямаш чым укусіць, нямаш чым перажаваць... Меў я такі досвед у Амерыцы. Якраз пачыналася рэцэсія і шмат эмігрантаў апынулася на бруку. Праца як праца — у фабрыцы акон на Грынпойнце. Стараўся я за яе тры тыдні. Быў гэта найцвярдзейшы ў маім жыцці кавалак хлеба. Аднак, утрымаўся я там чатыры дні і, мабыць, сцярпеў бы даўжэй, ды не вытрымаў са мною бос...

Стась з Кракава, якому прыдзялілі мяне ў якасці памочніка, быў вар'ятам або ідэалагічным стаханаўцам, або такім „wash and go", значыць адным і другім, бо і працаваў у вар'яцкім тэмпе. Іншая справа, што пры 11-гадзінным дні працы ён зарабляў 22 долары, а я 6,50. Сама работа цяжкай не была. Меў я служыць Стасю як „прынясі, дай, падмяці", або громаадвод яго пастаянна благога настрою. Так вось маім заданнем было тырчэць пры ім і маланакава рэагаваць на яго загады. „Цюліка падай мне" — распараджаўся Стась. „Божа мой, а што такое гэты цюлік?!" — пытаўся я ашарашаны. „А то ж то малая гаечка! — нервараваўся пан Стась. — От і памочнік! Не ведае, што такое цюлік!". Праўду кажучы, я за ім не паспяваў. Ды хто б за ім паспеў? Калі назаўтра, апрача мяне, стала пры Стасю трох дадатковых памочнікаў, таксама мы ўсе ледзь за ім паспявалі. Мы вельмі стараліся, бо аднаго з нас было замнога.

Перад ланчам прыляцеў да нас бос. Пішу „прыляцеў", бо не хадзіў ён, не бегаў, а лятаў як апараны, размахваючы прытым рукамі. Ну, сапраўдны верталёт! Калі толькі прызямліўся, правёў сярод нас — Стасевых памочнікаў — апытанне: „Што вы рабілі ў Польшчы?". Усе мае калегі, практыкі азнаёмленыя з рознымі будаўнічымі працамі, адказвалі паводле праўды, гаворкі і разліку — плітачнік, слесар, рабочы... „Ну, а пан?" — звярнуўся да мяне бос. І я адразу адчуў пах тэатральнай сцэны і пораху са стрэльбы, якая паказаная ў першым акце мусіць выстраліць, вядома, у фінале... „Журналіст". „Ну... — тут бос раскінуў рукі. — То ўжо маем яснасць!"

На чацвёрты дзень бос зноў нас наведаў. Не звяртаў я на яго ўвагі, займаючыся шалёўкай і цэментаваннем нейкай дзіры. Урэшце канкрэтная работа, цешыўся я, калі даручыў мне яе Стась. Праўда, лаяльна я яго папярэдзіў, што ніколі такога я не рабіў, ды ён па-свойму гыркнуў: „А ці мяне гэта цікавіць!" — і толькі я яго бачыў. Абклейваў я тую дзіру паводле ўзораў майстэрства падгледжанага ў муляроў, цэментам змешаным з пяском у прапорцыях мне невядомых ды абраных, узмоцніўшы яе, як мне здавалася, так як робяць гэта спецы, нейкімі палачкамі. І тады якраз ашчаперыўся нада мною бос. „Добра, добра, што вы гэтую дзіру ашалявалі... О, халера! Не, не! — тут збянтэжыўся. — Трэба было яе ашаляваць дошкамі... не галінкамі! Кепска! Ну, значыць, вы добра падумалі, ды праўдападобна, так сказаць, хранова пачалі". Як гэта сказаў, так і паляцеў, размахваючы рукамі... Ну, верталёт! Праз момант замяніў мяне пры дзіры адзін з калег. Вядома, стрэльба мусіць выстраліць! Я апусціўшы рукі стаў пры Стасю. „Прунд! Прунд!" — распарадзіўся. Адкінуў дрэль і пабег кудысьці — куды? Ужо вярнуўся, трасе пілою. „Прунд! Прунд!" — дзярэцца. Я дадумаўся, што піла не падключана да электратоку. Бягу да скрутка кабеляў і кабельчыкаў. Вырываю з уключальніка нейкі кабель — хіба ад дрэля. „Прунд! Прунд!" — злуецца Стась. Не той штэпсель! Перавальваю кабелі. „Прунд! Прунд!" Гуркоча піла... Момант. Бо Стась кінуў яе на путавіну кабеляў і пераскочыў пяць метраў далей. Ужо ў руках трымае дрэль. „Прунд! Прунд!" Грабуся ў кодле кабеляў. Раптам мае пальцы ўгразаюць у нейкую ліпучку. „Прунд! Прунд" — кіпіць Стась. Прыгадалася мне, што пакуль пусцію у рух пілу, Стась смакавіта смарканўў сабе пад ногі. „Прунд! Прунд!"... Пад канец дня зноў прыляцеў бос. На хвіліну. Без слова падышоў да мяне, уручыў звітак купюр і без слова адляцеў. І так апынуўся я на бруку. Без слова! Бо што далі б скрыгат зубоў і ашчэрванне клыкоў? Нават сухі хлеб мне забралі.

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Задума спадарыні міністр

Нядаўна паказалася другое кніжнае выданне — падлік інцыдэнтаў, да якіх даходзіла ў Польшчы на ксенафобнай і расісцкай глебе. Гэтая „Карычневая кніга" ахапіла 2009-2010 гады (папярэдняя адносілася да 1987-2009 гадоў). У гэты раз аспісаны ў ёй больш за чатырыста выпадкаў м.інш. здзейсненых неанацыстамі і крайнімі правымі. Гэтае падвядзенне зрабілі Згуртаванне „Nigdy więcej" і Цэнтр маніторынгу расізму ва Усходняй Еўропе. Інфармацыі, змешчаныя ў публікацыі, паходзяць ад карэспандэнтаў Згуртавання, прадстаўнікоў меншасных арганізацый ды з прэсавых артыкулаў і тэле- ды радыёперадач. „Гэта сумная хроніка, ды вельмі патрэбная. Калі яе лістаем, немагчыма сумнявацца наконт абсягу і маштабу з'явы ў нашай краіне", — так у папярэднім выданні „Карычневай кнігі" выказаўся прафесар Міхал Главінскі, гісторык і тэарэтык літаратуры, член Польскай акадэміі навук. Аўтар кнігі Марцін Корнак адзначыў ва ўступе да навейшага выдання: «„Карычневая кніга" не з'яўляецца публікацыяй навукова-юрыдычнага характару і не павінна ў такі спосаб успрымацца. Цяперашняя апрацоўка ўзнікла пры прымяненні журналісцкіх метадаў і публіцыстычных прылад».

З падляшскага ксенафобнага і расісцкага падворка можна тут знайсці шырока апісваныя, асабліва ў рэгіянальных СМІ, выпадкі атакаў на іншаземцаў, такіх як той, які здарыўся ў красавіку 2009 г., калі дзесяць маладзёнаў пабіла на беластоцкім мікрараёне Лясная Даліна 34-гадовага чорнаскурага француза. Некалькі раз апісваны былі здарэнні, якія адбыліся ў Ломжы. Тут даходзіла да расісцкіх нападак на чачэнцаў, прабываючых у прытулку для бежанцаў. Адзін з найбольш ашарашваючых мясцовых выпадкаў быў зафіксаваны ў Аўгустове. Камендант мясцовай Дзяржаўнай супрацьпажарнай стражы і яго намеснік віталіся з падначаленымі „Heil Hitler" і неаднаразова вызывалі іх словам „Pedały!". Абодва каменданты ўжо не працуюць пажарнікамі, а пракуратура пасля выяўлення гэтага прэцэдэнту пачала ў адносінах да іх судовы разбор.

Мабыць, выпадкам зараз пасля выдання новай „Карычневай кнігі", упаўнаважаная ўрада па справах роўнага трактавання ў ранзе міністра Альжбета Радзішэўская выслала арганізацыям нацыянальных меншасцей ліст з запрашэннем да супрацоўніцтва ў рамках выдуманай сабою акцыі „Wymiećmy ksenofobię z ulic — letnie porządki dla tolerancji". Як напісала, мэтай мерапрыемства з'яўляецца „zwalczanie antysemickich, rasistowskich i ksenofobicznych napisów na przestrzeni polskich miast". У рамках акцыі моладзь мае вышукваць зняважлівыя надпісы ксенафобнага характару, сфатаграфаваць іх і перадаць у яе бюро. Кожная справа, „у выпадку сцвярджэння, што змяшчае яна прадпасылкі наконт парушэння дабра прадстаўнікоў нацыянальных, этнічных ці рэлігійных меншасцей, будзе накіравана ўладам горада, у якім апынуўся згаданы надпіс з просьбай неадкладных, згодна з кампетэнцыямі, дзеянняў з мэтай устаранення надпісу з публічнай прасторы". Задума спадарыні ўпаўнаважанай, сапраўды, шляхетная. Толькі я не разумею, нашто ёй патрэбная ўстанова для дасягнення гэтай мэты, прынамсі ў Беластоку. Апошнія гады паказалі, што ў кожным выпадку, калі паяўляюцца такога тыпу зняважлівыя надпісы ў беластоцкай публічнай прасторы, амаль зараз яны гарадскімі службамі ліквідуюцца. А знакамітым інфарматарам у такіх выпадках з'яўляюцца лакальныя СМІ.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Аляксей МАРОЗ

Як адпачывалі і адпачываем

З пачаткам ліпеня распачаўся сезон масавых водпускаў, у час якога адны беларусы Беласточчыны адпачываюць, а іншыя працуюць, толькі інакш. Калі, паводле апытання, больш чым палова жыхароў Польшчы ў гэтым годзе мае адпачываць дома, а толькі каля 10% палякаў рашыцца на адпачынак па-за межамі краіны, то сярод нашых беларусаў паказчык людзей, якія будуць адпачываць дома, павінен быць яшчэ большы, бо і ўзровень жыцця і заробкаў ва ўсходняй Польшчы ніжэйшы ад сярэдняга ў краіне. Сярод асоб, якія дэкларуюць прыналежнасць да беларускай нацыянальнасці, таксама адсотак выхадцаў з вёсак у першым пакаленні намнога вышэйшы, чым у сярэднім у Польшчы, а на нашых сёлах здаўна трымалася і надалей захоўваецца традыцыя адпачынку ў святочныя дні і працы ва ўсе будзённыя, хаця, канешне, з рознай інтэнсіўнасцю.

Стагоддзямі трымаліся склаўшайся традыцыі

Нашы продкі, якія летам жалі збожжа сярпамі, а зімой малацілі цапамі, так арганізавалі сваю працу на працягу цэлага года, каб справіцца з ёй у будныя дні. У час святаў займаліся яны толькі неабходнымі хатнімі заняткамі і жывёлай, якая патрабуе кругласутачнага дагляду, а апошні час праводзілі святочна — з раніцы ў царкве, а пазней з сямейнікамі, сваякамі і знаёмымі. Дзяўчаты таксама вымушаны былі памагаць у гаспадарцы з раніцы да вечара, а ў доўгія зімовыя вечары пралі, ткалі і таксама толькі ў святочныя дні мелі час на сустрэчу ў сваёй кампаніі і на танцы. Льготы зімой тычыліся ў галоўным кавалераў, якія спатыкаліся зімовымі вечарамі нават у будныя дні і прыходзілі на пакудзелле да дзяўчат. Можна сказаць, што нашы продкі, якія найчасцей належалі да мужыцкай праслойкі, праводзілі час згодна з бытавымі патрэбамі і традыцыяй. Адпачынак ад скаромнага харчавання гарантавалі пасты, а адпачынак ад штодзённай працы — святочныя дні.

Тыя, што ў першым пакаленні выводзяцца з вёсак, ведаюць, што яшчэ пры народнай уладзе выезд вясковага жыхара на даўжэйшы адпачынак быў вялікай рэдкасцю, калі нават тая асоба ў асноўным зарабляла грошы на нейкай дзяржаўнай пасадзе. Нават у такіх выпадках сельскія людзі часта куплялі або бралі ў арэнду поле і ў нейкіх хлеўчыках гадавалі сабе вепручкоў, курэй ці гусей і нават па гэтай прычыне складана было ім пакінуць дабытак на дагляд суседзям. Па нашых сёлах не было традыцыі адпачынку па-за домам і можа таму не прыйшлося мне ў мінулым спаткаць гаспадароў, якія марылі, каб пакінуць дабытак і паехаць у водпуск. Затое сярод малодшых вясковых жанчын і раней можна было сустрэць такіх, якія марылі, каб хаця на тыдзень пакінуць кароў і свіней і паехаць у адпачынак з сям'ёй. Але такія мары маглі здзейсніцца толькі тады, калі дома жылі бацькі, якія маглі б дапамагчы маладым. Аднак я не ведаю ніводнага такога выпадку з часоў, калі я жыў у вёсцы, каб гаспадары з майго або суседніх сёл рашыліся пакінуць дабытак нават у зімовы час і паехаць у водпуск. Можа па частцы і таму па нашых вёсках асталося так многа нежанатых кавалераў, а дзяўчаты масава выехалі ў гарады, рашаючыся там нават на „непрэстыжныя" заняткі, каб толькі магчы жыць паводле гарадскіх стандартаў. Аднак, пачынаючы ўжо з сямідзесятых гадоў, паявілася рэальная магчымасць выезду вясковых жанчын на лячэнне ў санаторыі, а пазней на рэабілітацыйныя турнусы. Некаторыя вясковыя людзі пачалі карыстацца такім шанцам. Гаварылася нават тады, што пасля такога лячэння лягчэй атрымаць рэнту.

Яшчэ і зараз часткова трымаемся мінулага

— З маёй жонкай нешта здарылася. Захацела яна, каб мы выехалі недзе далей у адпачынак, а ў мяне ж на гаспадарцы многа працы, — расказваў жыхар Гайнаўкі, які добра зарабляе ў прыватызаванай суполцы і яшчэ абрабляе бацькаўскае поле непадалёк ад горада. Думаю, што ў гэтай сям'і не было фінансавых перашкод, каб адкласці адпаведныя сродкі і пасля заканчэння палявых работ выехаць на супольны адпачынак. Аднак мой суразмоўца ніколі так не рабіў і хутчэй за ўсё лічыць, што грошы, якія мог бы растраціць далёка ад дому, можна выдаткаваць на больш патрэбныя для сямейнага жыцця інвестыцыі. Можна ж папоўніць банкаўскі інвестыцыйны рахунак, модны апошнім часам і засноўваны дзеля паляпшэння будучыні дзетак, адкласці грошы на новы аўтамабіль, на ўцяпленне дома ці на многа іншых патрэб.

— Мне адзін раз удалося пераканаць свайго мужа на супольны выезд з дзяцьмі і сябрамі на мора. Муж тады часта наракаў, што сядзім там без працы. Вярнуўшыся дамоў, ён рашуча заявіў, што больш на такі адпачынак не паедзе, — расказвала жанчына з Гайнаўкі, ураджэнка падгайнаўскай вёскі.

Іншы жыхар Гайнаўкі, які пераехаў сюды на пастаяннае жыхарства з падгайнаўскага сяла, таксама гаварыў, што толькі адзін раз адправіўся разам з жонкай у адпачынак.

— Ты ведаеш, колькі грошай трэба дадаткова растраціць у час адпачынку ў курортнай мясцовасці? Няма канкрэтнага занятку, то штодзень ходзіш з жонкай у кафэ або рэстаран і там імпрэзуеш. Я адзін раз зафундаваў такі выезд і больш не рашыўся, — заявіў мой знаёмы.

Аднак зараз штораз больш нашых людзей выхаваных з дзяцінства ў гарадах і частка выхадцаў з нашых вёсак, што зарабляюць больш чым сярэдняя ў нашым рэгіёне, сталі адкладваць штомесячна грошы на адпачынак па-за домам. Некаторыя з іх бяруць таксама крэдыты, каб, напрыклад, паехаць на экскурсію ў замежную краіну.

— Я збіраюся ехаць у водпуск на тэрыторыю былой Югаславіі, — сказаў жыхар Гайнаўкі. Я меў уражанне, што ў ягонай хаце жонка вырашае аб галоўных напрамках інвеставання заашчаджаных грошай і магчыма, што марыла аб далейшым падарожжы, што ў іх ужо здзейснілася. Аднак у частцы выпадкаў гэта мужчыны выступаюць завадатарамі выездаў у адпачынак.

— Хаця на некалькі дзён удалося мне выцягнуць жонку і дзяцей у адпачынак. Затрымаліся мы над возерам на Мазурах. Жылі ў агратурыстычнай кватэры, таму і танней абышоўся наш выезд, — расказваў знаёмы з Беластока, які тады ашчаджаў сродкі на рамонт дома. Але ён ужо з моладасці выязджаў у водпуск па-за горад і тая прага адпачынку па-за сваім месцам жыхарства ў яго асталася. Калі ўжо нашыя людзі, напрыклад з Гайнаўкі, рашаліся выязджаць у даўжэйшы адпачынак, летам выбіралі Мазуры і Балтыйскае мора, а зімой найчасцей адпраўляліся ў польскія горы. У выпадку замежнага адпачынку апошнім часам часта выбіраюць тэрыторыю былой Югаславіі, а раней у час тамашніх войнаў часцей адпраўляліся ў Іспанію, Партугалію ці Італію. Некаторыя з маіх знаёмых ехалі папрацаваць, а пасля адпачыць на Кіпр, ці ў Нарвегію. Бывае, што праваслаўныя гайнавяне спалучаюць паломніцтвы з адпачынкам і ездзяць у Расію, Украіну, ці Беларусь. Нават у гэтым турыстычным сезоне ладзяцца паломніцтвы, у час якіх прадбачваецца адпачынак на Чорным моры і наведванне цікавых свецкіх месц у Грэцыі. Некаторыя гайнавяне перад Вялікаднем рашаюцца наведаць Святую Зямлю перш за ўсё дзеля малітваў у святых месцах, а таксама дзеля знаёмства з вельмі багатай гісторыяй і традыцыяй гэтага кутка Зямлі.

— Мы з жонкай спачатку ездзілі ў час водпуску ў адпачынак у розныя месцы Польшчы, а пасля ў цёплыя краіны Еўропы. Зараз, калі ў нас малыя дзеткі, водпускі праводзім у асноўным дома, — сказаў мне саракагадовы сябра з Гайнаўкі, выхаваны ў горадзе ад дзяцінства.

— Маіх бацькоў-пенсіянераў не ўгаворыш на экскурсію ці адпачынак па-за Гайнаўкай. Думаю, што нашае пакаленне будзе ўжо іншым, калі мы пяройдзем на пенсію, — сказаў мужчына, якому пад пяцьдзесят гадоў і які адносна добра зарабляе і разам з сямейнікамі часта выязджае ў замежны адпачынак. Аднак такіх як ён у Гайнаўцы адносна мала. Большасць саракагодкаў і старэйшых выхадцаў з нашых сёл, што жывуць у Гайнаўцы ці Бельску-Падляшскім, не рашаюцца выязджаць у адпачынак далей ад дому. Напэўна вялікім тормазам у гэтым плане з'яўляюцца невялікія заробкі. Апошнім часам штораз больш нашых выхадцаў з вёсак, а асабліва тыя ў пенсіённым і дапенсіённым узросце, ахвотна адпачываюць у дамах, што асталіся па бацьках і называюць такую пабыўку на прыродзе таннай, здаровай і карыснай. Маюць там магчымасць падправіць плот, паабрэзваць сухое галлё на дрэвах або паволі рабіць невялікі рамонт у хаце, а пад вечар прысесці з жонкай у цяньку, а ў святочны дзень наведаць вясковых сяброў з моладасці і паразмаўляць аб тых гадах, калі радасна жылі ў сваёй кампаніі. Іншая справа, што ў сёлах цяпер цяжкавата знайсці калег, якія масава павыбіраліся ў гарады, але ў такім выпадку добра таксама наведаць старэйшых людзей або ўзяць машыну і паехаць на беларускі фэст.

— Хаця частку буднага дня трэба папрацаваць, але для поўнага адпачынку ёсць жа святы, — разлічвае вялікая частка нашага грамадства, так як лічылі нашыя продкі ў мінулым.

Чэслаў Мілаш — непрысутны і прысутны

Я ўважліва прачытаў у «Ніве» ад 19 чэрвеня артыкул Ганны Кандрацюк «Мілаш сугучны беларускаму свету». У Ольштыне адбыліся шматлікія мерапрыемствы, прысвечаныя Чэславу Мілашу. Ваяводская публічная бібліятэка наладзіла сустрэчу пад лозунгам «Чэслаў Мілаш — няма яго, але надалей прысутны». Запрошаныя госці чыталі творы выдатнага паэта па-літоўску, па-беларуску, па-руску і па-жыдоўску, расказвалі пра Вільню, пра мастацтва перакладу. Мэтай сустрэчы была папулярызацыя творчасці Чэслава Мілаша з нагоды Года Мілаша, прамоцыя сотай гадавіны з дня нараджэння паэта, стваранне чытальніцкай культуры жыхароў Ольштына. У Мілашаўскім салоне працавала выстаўка «Свет, паэмы наіўныя Чэслава Мілаша». Былі сустрэчы прысвечаныя творчасці паэта.

У Мілашаўскім салоне вершы Чэслава Мілаша, перакладзеныя на беларускую мову Андрэем Хадановічам, чытаў прафесар Мечыслаў Яцкевіч; вось адзін з іх, «Ты, што пакрыўдзіць пасмеў», напісаны ў 1950 годзе ў Вашынгтоне:

Ты, што пакрыўдзіць
пасмеў чалавека,
Боль і пакуты
зняважыўшы смехам;
Блазны твае адгукаюцца брэхам,
Праўду і крыўду
мяшаючы ў здзеку.
Маеш гурму падхалімаў, ахову,
Узнагароды, партрэты, парады;
Хтосьці табе пакланяецца рады,
Што яшчэ дзень
пераважыў паспяхова...
Не расслабляйся!
Паэт не забудзе.
Можаш забіць яго
— з'явіцца новы,
Ён захавае ўсе ўчынкі і словы.
Лепш бы ты выбраў
світанак зімовы,
Сук і пятлю ў справядлівыя суддзі.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Мокрая рыба

Пятроўка. Так у нас называюць пост перад святам Пятра і Паўла. Мая жонка Соня задумала, каб хоць у сераду ды пятніцу пасціць і купіла марожаную рыбу — філе з мінтая 0,75 кіло. Я вельмі люблю рыбныя стравы і падумаў: „Во, у пятніцу будзе вельмі смачны абед!". Калі мы размарозілі тыя тры рыбныя філе, у пасудзіне аказалася вельмі многа вады. Пацікавіўся я, колькі будзе „чыстай рыбы". Паклаў я яе ў той фольгавы пакецік, у якім Соня яе прынесла і паклаў на вагу. Мы вырачылі вочы: рыбы было 0,33 кіло!

Вось, мае даражэнькія: вады было больш за 50% у тавары! Гэта значыць, што мы заплацілі 9,80 зл. за кілаграм вады!

Ёсць у нас кантрольныя гандлёвыя і найвышэйшыя палаты. Ці яны гэтага не бачаць, ці мо не хочуць бачыць? Перарабляюць харчы прыватныя прадпрыемствы, а мы, спажыўцы, плацім ім за несумленную работу. Яны становяцца мільянерамі ў краіне і няблага ім жывецца. Адпаведныя ўстановы павінны за такіх узяцца, каб працавалі сумленна, без абману!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Бельскія сустрэчы (6)

Тэкст і фота
Уладзіміра СІДАРУКА

На сустрэчу з войтам Арлянскай гміны збіраўся я даўно. Першым разам праблема датычыла падтаплення сядзібы Емяльяна С. у Рыгораўцах. За другім разам узнікла рознагалоссе наконт продажу школы ў Пашкоўшчыне. І хоць у абодвух выпадках войт завяршаў размову словамі „Прыязджайце, высветлім справу на месцы", маё падарожжа ўвесь час неяк ускладнялася. Сёлета трапілася чарговая нагода.

Войт Пётр Сэльвесюк

— Прадалі ў нас школу, — гаварыў на рынку сябрук з Маліннік. — Прыватнік купіў. Кажуць, што заплаціў трыста пяцьдзесят тысяч злотых. Гасцінніцу хоча адкрыць. Прыедзь, Валодзька, — заахвочваў Сцяпан К., — напішаш, здымкі зробіш. Будова ў поўным разгары...

Калі пазваніў я ў Орлю і папрасіў войта аб аўдыенцыю, паясняючы чаго справа тычыцца, пачуў у адказ: «Не бачу праблемы. Запрашаю». Дамовіліся сустрэцца ў пятніцу 8 ліпеня.

Сцяпан Каляда, мой сардэчны прыяцель з Бельска, абяцаў падвезці ў Орлю.

— Буду на рынку ў Чаромсе, — тлумачыў калега. — Адтуль з роварам цябе забяру. Зачым справу аформіш у гміне, дык пачакаю, затым у Маліннікі падкіну. Далей падарожнічаць будзеш на ровары.

Са Сцяпанам не спаткаліся. Жонка прадаваць прыехала (раз'язным гандлем займаецца).

— Не хвалюйся, я завязу, — пацешыла Валя. А калі загаварылі пра продаж школы ў Маліннніках, дык заявіла: — Разведай пры нагодзе пра школу ў Шчытах. Цэнтр беларускай культуры адкрылі. Паводле дамовы, ды ў акце натарыяльным памечана, што ўладальнік дазволіць жыхарам вёскі арганізаваць у клубе памінкі ды сямейныя імпрэзы. Але за найм залы кажуць па 100 злотых плаціць...

Сустрэча з войтам была назначана ў абедні час. Аднак сяброўка не заехала за мною на адзінаццатую. Канчаткова вымушаны быў я падацца ў падарожжа з унучкай.

З Кузавы выязджалі ў 11:20. Праз дваццаць мінут былі ў Маліннніках. За школай крутанулі направа і пашпарылі ў напрамку Орлі. Як верыць дарожнаму знаку, перад намі 8 км. Асфальтоўка аказалася рухлівай дарогай са шматлікімі крутымі паваротамі. Праезджая частка дарогі тут надта вузкая. Калі разміналіся з аўтамабілямі, вымушаны былі з'язджаць на абочыну. Паколькі ў гэтым наваколлі я знаходзіўся ўпершыню, з зацікаўленнем разглядаў мясцовы краявід: шырокую прастору паш і сенажацей, пасевы на палетках ды шумлівую сцяну прыдарожных дрэў. Мінулі Шарні. Вёска акуратна задбаная. Шыкарна памаляваны агароджы, жылыя дамы. Відаць, што людзям нядрэнна тут жывецца. З боку заставаліся Кашалі...

У гмінны цэнтр прыехалі перад дванаццатай. Папыталі пра дарогу ў гміну.

— Паедзеце проста, — патлумачыла жанчына на тратуары. — Вось гэты высокі будынак, што відаць, гэта гміна.

У прыёмнай за пісьменным сталом заспеў я маладзенькую чыноўніцу. Прывітаўшыся, кідаю ў яе бок:

— Я дамоўлены з войтам...

— Пан Сідарук... Пачакайце хвілінку...

Пасля праанансавання заходжу ў кабінет войта. Знаёмімся. Пачынаем размову.

— Скажыце, калі ласка, — звяртаюся да Пятра Сэльвесюка, — калі абвясцілі аўкцыён на продаж школы ў Маліннніках?

— Гэта было недзе каля 2000 года, — пачынае войт. — Браўшы ва ўлік кошты ўтрымання ды страхоўкі, вартасць маёмасці вызначылі на 192 тысячы зл. плюс 5 тысяч зл. кошту дакументацыі. Разам 197 тысяч. На такую цану не было ахвотных. Чатырохкратна паўтаралі аўкцыён, без выніку. Праўда, у пазнейшым часе знайшліся купцы, але былі яны зацікаўлены больш паніжэннем цаны, чым самой здзелкай. Мы не спускалі...

— Калі загаварылі пра Ікею і пачала завяршацца інвестыцыя, — працягвае войт, — аб'явілі мы пяты аўкцыён. Цану вызначылі першапачатковую — 197 тысяч зл. Да таргоў прыступілі дзве асобы: Славамір Бяроза з кампаньёнам ды Мікалай Лемеш з Кашалёў. Сапернікі ўзаемна падбівалі цану. Перамог Славамір Бяроза. Купіў маёмасць за 350 тысяч злотых.

— А што са школаю ў Шчытах? — перамяняючы тэму пытаю войта.

— Гэта больш складаная праблема, — паясняе Пётр Сэльвесюк. — Будынак двухпавярховы, мураваны, але папаў у руіну. Гміна не была ў змозе заняцца добраўпарадкаваннем з-за высокіх коштаў адаптацыі. Таму выставілі на продаж. Ахвотныя былі купіць школу, але за невялікую цану. Гміна памяркоўна ставілася да іхняй прапановы ды і жыхары вёскі выказвалі волю, каб будынак прыватнікам не прадаваць, а выкарыстаць на патрэбы вясковай супольнасці. Таму дайшлі да высновы, каб перадаць маёмасць за сімвалічную залатоўку маладзёжнай арганізацыі. Паколькі ў гміне, паводле перапісу, пражывае больш шасцідзесяці працэнтаў беларускага насельніцтва, затым вырашылі прадаць будынак Звязу беларускай моладзі за 10% вартасці маёмасці, значыць, за 10 тысяч злотых. Здзелку завяршылі натарыяльным актам.

— Ужо ў пачатках быў распісаны (затым адобраны) праект, паводле якога прызначана чатырыста тысяч злотых на рамонт будынка. Работы рушылі з пачаткам 2011 года. Цяпер атрымалі чарговыя трыста тысяч на далейшы рамонт.

— Ці на тэрыторыі Вашай гміны знаходзяцца яшчэ нейкія пустуючыя школьныя будынкі?

— Раней прадалі школу ў Вульцы-Выганоўскай, — паясняе суразмоўца. — Быў адзіны купец і яму прадалі за вызначаную цану 75 тысяч зл. Гэтыя грошы прызначылі на вясковую святліцу. Побач драўлянай школы збудавалі мураваны будынак. Кошт пабудовы святліцы склаў каля чатырохсот тысяч зл. (з абсталяваннем). Гміна дакінула да гэтага каля трыста тысяч зл. Школьны будынак прыватнік прыстасаваў сабе на дачу. Такім чынам вырашылася праблема пустуючых школьных будынкаў, — сказаў войт Пётр Сэльвесюк. — Як бачыце, самаўрад пазбягае коштаў утрымання былой школьнай маёмасці, а жыхары гміны маюць добра абсталяваныя культурныя цэнтры.

— А што з платай за найм залы праз мясцовае насельніцтва? Кажуць, што ў Кашалях патрабуюць аж 200 злотых.

— Гміна за найм святліцы на памінкі ці „васемнаццатку" ад жыхароў не бярэ ніякай платы, — канстатуе Пётр Сэльвесюк. — Гэта неабгрунтаваная гаворка. Аплату бярэм адно ад выхадцаў данай вёскі, якія жывуць, напрыклад, у Бельску ці іншай мясцовасці. Яны ўжо не лічацца жыхарамі салэцтва і таму павінны несці назначаныя кошты найму, як у рыначнай эканоміцы. За святліцамі ў гміне наглядаюць светліцовыя і ім плацяць за электраэнергію скарыстаную ў час імпрэзы. Я пазваню ў Кашалі і праверу факты, — завяршыў мой субяседнік.

Непрыкметна сцякла гадзіна часу размовы з войтам. Хацеў я крануць іншыя тэмы, але спадар Сэльвесюк заявіў:

— Прабачце, у 13 гадзін назначана ў мяне чарговая сустрэча...

Пры развітанні ўдалося мне паставіць яшчэ адно пытанне:

— Што скажаце, спадар войт, наконт раней аб'яўленай Вамі інвестыцыі — ветраных электрастанцый?

— Справа актуальная. Крыху доўжыцца афармленне дакументацыі, але лічым, што рэалізацыя інвестыцыі пачнецца пры канцы гэтага года, або ў пачатках наступнага. Пятнаццаць такіх электрастанцый будзе збудаваных непадалёк Спічкоў ды паміж Крывятычамі і Шчытамі.

Жадаю затым поспехаў у рэалізацыі задачы і дзякую за размову.

Кветкі ў блоках

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Марыя Каральчук, яе дачка Геня і Марыся Стэпанюк

На лавачцы пад блокам № 2 на „аседлі Бандары" сядзяць жанчыны, чакаючы гасцёўні.

— Што засталося... Мы пасаблялі сынаві будаваць у Васількове хату, мы сюды не выбіраліся, думалі, што там будзем жыць, — уздыхае бабулька ў хустцы. — І нам тут не давалі. А пасля прыехалі да сына з ВЗІРу і пытаюцца: „Дзе бацька, дзе матка?". Сын кажа: „Дзе? Не даяце кватэры, то ў мяне тыдзень, то ў дачкі тыдзень, то ў другога тыдзень... І так ходзяць як тыя цыганы". „To niech przyjadą, to my damy im mieszkanie". Я паехала туды да іх, і зараз нам гэтую кватэру ў блёку далі, — працягвае Марыся Каральчук, Сашава жонка, з роду Віткоўская. — Дзед быў „польскі", бабця была „польская", а тату ўжо хрысцілі ў царкве. Мой тата называўся Лукаш. Наша хата ў Луцэ стаяла каля Жукоўскае Манькі, чалавек яе Бэнэк называўся. Колькі гаспадароў у Луцэ было? О-о-ой! Было каля 150! Хаты былі і на адзін бок і на другі вуліцы, і на агародах, на адным падворку па тры хаці! Ой, добра было. Мы вымуравалі з цэглы стадолу, укрылі яе, і ўсё, і драўляная стадола была, і хлявы, і новая хата пастаўлена была, харошая. Ну і што, ну? Усё прайшло. І цяперака, каб у сваёй хаце, то сядзець бы спакойна...

Марыя Стэпанюк-„Ясева" — з Рудні, калісь Анхімянка:

— Ой, у сваёй хаці трэба было б дроў загатовіць.

— А тут як? Тут тэж трэба цяперака... Бачыце, няма вады цёплае.

— Чом адключылі ваду? Некаторыя не плацілі за ваду. Дык не схацелі грэць, і ўсё.

— Цяпер, як абмыцца, трэба ставіць два ці тры гаршкі, нагрэеш, тады ў ванну нясеш. Выліеш, тады халоднае дабаўляеш, і так мыешся.

— А цяпер так прапануюць, так і будзе — у кожным блёку кацельню рабіць. І колькі гэта будзе каштаваць.

Марыся „Ясева" жыве ў кватэрцы ў 35 метраў, на руднянскія імпрэзы ўжо не ідзе: „Я старая ўжо".

— Шчэ вы не старыя, я старая — мне 90 гадоў, — удакладняе Марыся Каральчук. — Жыву тут з дачкой. Дачка дзяцей пажаніла. Дачка ў яе інжынер, за інжынера выйшла. Засталася ўдава, мы на яе хату перапісалі, з бацькам як купілі. І яна да мяне пайшла. Даволі прыходзіцца плаціць за хату! О, Геня карціну купіла!

— Кветкі. Каб пасавалі ў хаце, каб хораша было. 200 злотых.

— Геня, 200 ці 20?

— Дзвесце. Бо гэта алей. Дарагі? Вы то не ведаеце, якія дарагія карціны! А такая імпрэза ў Бандарах — раз у год толькі. Беларуская!

— Усю ноч будуць ламатаць, — інфармуе Марыя „Ясева" і прыгадвае: — Мы беларусы самі, і дзяды, і прадзеды. Пытаўся мяне праз тэлефон перапісчык: „Якога вы паходжання". Кажу: усе — і бацькі, і дзяды — усе размяўляем па-беларуску. На вёсцы ўсе так гавораць. „Ale pani rozmawia i po polsku, i po białorusku". Кажу: так. Ну не? — смяецца. — Хадзілі ў школу, то вучыліся па-беларуску. Наш Федзік з Рыбакоў пісаў у „Ніву", ужо памёр. Доўга жыў, 95 гадоў... Ой, як міла пасядзець, добры, здаровы вецер...

— А нам тыя хаткі забралі і папрадавалі, — прыгадвае Марыся Каральчук. — Іншыя людзі ад іх купілі — на Новую Луку. Паразбіралі, паскладвалі. Каля нас жылі Анцуткі — Саша з Оляй, Пецева дачка... Яе бацька быў мой дваюрадны брат. І яны тут жывуць, я во пасярэдзіне ў блоку, а яны па баках. Ці **туды** заходжу? У сваю Луку? Была калісь, а цяпер не, бо ўжо не дам рады хадзіць, ногі баляць. Чалавек адрабіў, адхадзіў. Як той казаў — вочы адглядзелі, рукі адрабілі, ногі адхадзілі. Ну. Вядома, у такіх летах... Што зробіш. Мусіш так жыць як ёсць. Яшчэ добра, што дачка ёсць. Мой мужык пражыў 88 гадоў. Быў ад мяне старэйшы на 12 гадоў. І ў вайну зацярпелі, бо немцы вывезлі былі нас у Беласток, да гаспадароў усадзілі — яны ў адным пакоіку, мы ў другім. Потым немцы Сашу забралі на прымусовую работу, калёсы рабіць, бо ён столярам быў. А я з дзіцем і свякрухай жылі. Як сталі налёты! Мы выйшлі былі на вуліцу. Як дала бомба ў тую хату — усё маё згарэла. Усё! Я тое дзіцяня — мела два рокі — на рукі ўзяла і да Лукі прынесла. Чалавек быў на рабоце, маці засталася, бо старая была. Маці пайшла да тых немцаў, упала на калені, стала цалаваць рукі і ногі: „Пусцеце мне сына, пусцеце, бо я ўжо прападу. І ён прападзе!". Пусцілі, і яны ноччу на другі дзень прыйшлі дахаты, у Луку. Прыйшлі, у хаце сталі. Маці пачала пільнаваць хлопца, а я да людзей вёрст пяць іду на работу пасабляць рабіць. Што зараблю, у Гайнаўку іду хлеб купляць. На спіну бяру і нясу той хлеб, бо няма з чаго жыць... Пажыла, то зажыла ўсяго!.. Я з 1921 года. 26 ліпеня канчаю 90 гадоў. А цяпер з вачэй адно слёзы ідуць... Што зробіш, мусіш жыць, пакуль пара прыйдзе. Прыйдзе пара — і фора з двара!

— А я кветкі купіла, карціну, каб хату ўпрыгожыць, — інфармуе іншую суседку дачка Марысі Каральчук, Геня.

— Харошыя. І рама харошая. Але — 200 злотых?

— Але і рама харошая, і палатно.

— А я свае палотны, маміны, выкінула вон, — уздыхае Марыся „Ясева". — Як высяляліся, павыкідвалі ўсё. Не ведалі, і не думалі, што калісь спатрэбіцца.

— Маю крыху іншых карцін у хаце. Але ці яны такія харошыя? Харашэй у хаце, — цешыцца Геня.

— А наш Генік прынёс на карціне сваю хату з Боўтрык., — кажа суседка. — Яшчэ бабіну хату. Хораша зроблена, вымалявана. Адно вакно не відна, бо там вішня, яблынька, а ў другім стаіць на падваконніку кветка. Хата нумар 15, а наша — 17. Мастак сам намаляваў, калі яшчэ не залілі нашай вёскі. А здымак маёй мамы, Марыі Болтрык, нават у ратушы быў, Смольскі зрабіў.

— О, многа нашых на здымках засталося, на памятку. А гэты кветкі — такія харошыя... — цешацца светла-блакітныя вочы старэнькай Марыі Каральчук.

Віктар БУРА

Каб памяць не сцерлася...

Гора людзей з затопленых вёсак, якія апынуліся на дне Семяноўскага вадасховішча, было вялікае. Цяжка знайсці словы, каб апісаць плач сялян, якія беззваротна і не па сваёй віне страцілі сваю любімую зямлю-карміцельку. А яны ж гэтую зямлю палівалі ўласным потам, уласнай крывёю. Зямля давала жыццё чарговым пакаленням лучан, руднян, боўтрыкаў, гарбароў, буднікаў. Яны былі соллю гэтай зямлі, напаўняючы яе спеўнай беларускай мовай, звонкімі песнямі, беллю вышываных кашуль...

І трэба было пражыць многа гадоў пасля затаплення вёсак, каб сум і гора па страчаным бацькоўскім гняздзе падштурхнулі да дзеяння. Каб успаміны пра родныя мясціны не сцерліся, каб уваскрашаліся, адраджаліся ў наступных пакаленнях, неабходныя знакі памяці, сімвалы. Ад некаторых затопленых вёсак асталіся старыя крыжы, астатнія трэба ўшанаваць узвядзеннем новых.

Першы крыж-помнік паўстаў у Луцэ. Невыпадкова. Лука была найбольшай затопленай вёскай. Вылучалася яна дружалюбнасцю і прадпрымальнасцю сваіх жыхароў, іх пашанай да народнай традыцыі. Вёска магла астацца, але сталася найгоршае — залілі вадой. Тое ж сталася з Рудняй — невялікай вёскай з добразчылівымі людзьмі. Руднянскі прыдарожны крыж ацалеў, стаіць да сённяшняга дня. Дзякуючы самаўрадавым уладам Міхалоўскай гміны, праваслаўнаму духавенству і выхадцам з гэтай вёскі выконвае ён іншую ролю — склікае былых жыхароў на сустрэчы, прысвечаныя паміннаю іх малой айчыны.

Боўтрыкі былі шматлюднай вёскай. На жаль, прыгожы каменны крыж не ацалеў. Спадзяюся, што крыж-помнік па затопленых Боўтрыках будзе пастаўлены, дзякуючы руплівасці колішніх яе жыхароў. Няхай памяць аб вёсцы жыве ў крыжы-помніку.

Многія жыхары затопленых вёсак пасяліліся ў блёках у Бандарах. Але замест шчасця атрымалася гора. Пакінутыя самі сабе, жывуць, існуюць на грані беднасці. Трымае іх пры жыцці памяць. У адпаведнасці з народным календаром спраўляюць яны традыцыйныя святы, прытрымоўваюцца народных абрадаў і звычаяў. Значыць, паважаюць яны сваё роднае, шануюць свае карані. Малодшыя пакаленні павінны зрабіць усё, каб памяць не сцерлася, каб жыла ў людзях і сімвалах.

Юбілей хору «Bel Canto»

Як хутка мінае год за годам, і я пасівеў як голуб. Яшчэ нядаўна, дваццаць гадоў таму, Ян Палавянюк кіраваў хорам «Collegium Baccalarum» і прамінула гэта як снег, а цяпер прамінула ўжо пятнаццаць гадоў дзіцятку, як сам пяшчотна кажа. Калектыў «Bel Canto» пры Вышэйшай школе інфарматыкі і эканоміі ў Ольштыне налічвае зараз сорак асоб. У яго складзе студэнты, лекары, бізнесмены, настаўнікі... Праз хор прайшло 207 вакалістаў, частка з іх спявае з пачатку яго існавання. На працягу пятнаццаці гадоў хор даў 255 канцэртаў у краіне і замежжы, прыняў удзел у дваццаць адным конкурсе, з якіх прывезлі 29 узнагарод.

— Магчымасці хору — універсальныя. Спявалі мы харавыя партыі ў «Травіяце» Джузепе Вердзі, «Тосцы» Джакома Пучыні, IX сімфоніі Людвіга ван Бетховена, мюзіклах «West Side Story» Леанарда Бернштэйна і «My Fair Lady» Фрыдрыха Лёва, араторыях «Znalezienie św. Krzyża» Фелікса Нававейскага і «Stabat Mater» Караля Шыманоўскага, «Літургіі св. Іаана Златавуснага» Пятра Чайкоўскага, польскай прапрэм'еры «Гатычнага рэквіем» французскага кампазітара Філіпа дэ Канка, — пералічвае Ян Палавянюк.

Хор выступае таксама з нагоды важных мерапрыемстваў. Спявалі ў гадавіну смаленскай катастрофы, на стагоддзе «Роты» — выканалі яе на ўсходках ольштынскай ратушы. 90-годдзе «Вармінскага гімна» адзначылі на вуліцы Акаповай. Як падкрэслівае дырыжор, «канцэртам жыцця» быў удзел хору ў беатыфікацыйных урачыстасцях папы Яна Паўла II у Рыме 2 мая гэтага года. Тады ольштынскія харысты выканалі «Beatus Vir» Генрыка Мікалая Гурэцкага, «Вікторыю» Войцеха Кіляра ды кампазіцыі сучаснага італьянскага кампазітара Марка Фрысіны. У той сам дзень у касцёле св. Ігнацыя ў суправаджэнні Нацыянальнага сімфанічнага аркестра Польскага радыё выканалі імшу Міхала Лоранца «Missa Magna Beatificationis». 19 чэрвеня г.г. у ольштынскім замку хор даў канцэрт «Bel Canto — sacrum Wschodu i Zachodu», дзе прагучалі творы царкоўныя, песні Марка Фрысіны ды спецыяльна для гэтай нагоды — 15-годдзя хору — напісанае «Magnificat Warmińskie» Артура Жухоўскага.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Віншаванне

І вось ужо 55 гадоў маем магчымасць чытаць на роднай мове тыднёвік „Ніва". Яна знаёміць нас з усё новымі і новымі навінамі.

Я заўсёды з нецярпеннем чакаю новага нумара газеты, таму што ў кожным можна прачытаць нешта цікавае. Для мяне кожны нумар — гэта сустрэча з родным у розных кутках Беласточчыны. Было б пажаданым, каб „Ніва" больш матэрыялу прысвячала нашай лакальнай гісторыі, культуры, каб друкаваліся больш лагодныя артыкулы аб братняй Беларусі, каб „Ніва" аб'ядноўвала беларусаў на культурнай прасторы.

З нагоды юбілею віншую штатных працаўнікоў рэдакцыі і галоўнага рэдактара Яўгена Вапу. Жадаю чарговых поспехаў, цікавых тэм, новых здзяйсненняў на радасць і задавальненне беларусаў ва ўсім свеце, каб павялічылася кольнасць нашых сяброў і прыхільнікаў.

Віктар БУРА

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гульня, якая забівае гульню!

Чаму цяперашнія дзеці ўсё часцей глядзяць тэлевізар і гуляюць на камп'ютары і не хочуць пагуляць на панадворку?

У наш час усё з'яўляюцца новыя гульні, серыялы, фільмы і іншыя рэчы. Кожная з іх цікавейшая за папярэднюю. Моладзь перасталі ўжо цікавіць вандроўкі, язда на веласіпедзе і нават футбол. Захапляе адзін камп'ютар і ўсё! Калісьці моладзь не мела доступу да такіх дыдактычных дапаможнікаў, як цяпер. Але яны шукалі патрэбныя кніжкі, хацелі вучыцца. Яны ўмелі працаваць. Марылі пра добрыя школы, універсітэт. А сёння мала хто заглядае ў кніжку. Ніхто нам не кажа, што гэта кепска.

Частае і доўгае карыстанне камп'ютарам даводзіць да таго, што псуюцца вочы, кружыцца ў галаве. Наша псіхіка становіцца слабейшай. Мы не заўважым, калі трапім у залежнасць. Мы не можам адарвацца ад камп'ютараў і тэлевізараў! Не разумеем, што гавораць навокал жывыя людзі. Мы адарваныя ад свету...

Сучасная моладзь думае, што прагулка з сабакам нудная і таму найлягчэй сесці за камп'ютар. Няма ў нас зацікаўленняў, многім не ладзіцца ў жыцці. Усе жадаюць забыцца пра рэальны свет. Тады найлепш уключыць камп'ютар. Там не будзе праблемаў, там усё складаецца добра, ідэальна, адна радасць і гульня. Пасля, калі ўжо выйдзеш на панадворак пагуляць з сябрамі, у нікога няма ахвоты гуляць. І пачынаем гаварыць пра камп'ютарныя гульні.

Патрыція Ігнацюк, *Небасклон*,
выпускніца ПШ у Аўгустове

Гараскоп
(на другую частку канікул)

Вадалей (21.01. – 19.02.)

Нехта з тваіх сяброў стане „цёмным конікам" турніру і будзе касіць усе выйгрышы. У цябе таксама відавочны прыліў грошай.

Рыбы (20.02. – 21.03.)

З канцом канікул у тваім жыцці з'явіцца сімпатыя. Вы будзеце есці салат з цыкорыі. З вас будуць смяяцца, але вам будзе файна.

Баран (22.03. – 20.04.)

Ты закахаешся ў яе/яго кашулю бурачковага колеру. Пачнеш цікавіцца мастацтвам. Будзеш дапамагаць сям'і ў вялікіх парадках.

Бык (21.04. – 21.05.)

Нехта, каго ты лічыш дзіваком, у цябе закаханы. Ён яшчэ не ведае як прызнацца табе ў сваіх пачуццях. Апранайся ў сінія майкі.

Блізняты (22.05. – 22.06.)

Ты сустрэнеш цікавых людзей. Сярод іх будзе вялікі аматар катоў, ён замарочыць табе галаву. Ты таксама пачнеш цікавіцца кашэчай сям'ёй.

Рак (23.06. – 23.07.)

Неўзабаве ты сустрэнеш кагосьці хто спрычыніцца да паляпшэння твайго настрою. Аднак каб нешта з гэтага выйшла, табе трэба пайсці на цэласць. Не бойся, планеты табе дапамогуць.



Леў (24.07. – 23.08.)

Ты заразіш сваіх сяброў гумарам, сустрэнеш асобу, якая належным чынам ацэніць тваю непаўторнасць.

Дзева (24.08. – 23.09.)

У час канікул ты будзеш закаханы. У тваёй хаце адбудзецца вялікая сварка.Сцеражыся ўсялякіх разборак.



Шалі (24.09. – 23.10.)

Ты будзеш шмат размаўляць са сваёй сімпатыяй. У цябе не хопіць часу для сям'і і сяброў.

Скарпіён (24.10. – 22.11.)

Ты сустрэнеш кагосьці, хто шчыра з табой пагаворыць. У цябе будуць планы паехаць на замежную экскурсію.

Стралец (23.11. – 22.12.)

Сапраўднае каханне ты сустрэнеш у час гэтых канікул. У цябе будуць праблемы з фальшывымі сябрамі.

Казярог (23.12. – 20.01.)

Хтосьці з тваіх сяброў падрыхтуе табе сюрпрыз. Ты навучышся плаваць. Асцерагайся жанчыны з гарбатым носам.

Оля Варшыцкая, *Небасклон*,
Белгімназія ў Бельску-Падляшскім

Патрык ці Пракоп?!

У наш час штораз часцей можам сустрэць беларусаў, якія называюць сваіх дзяцей старадаўнімі імёнамі. Гэтыя імёны належалі перш за ўсё нашым продкам, але таксама славутым паэтам і пісьменнікам. Я думаю, што калі ў чалавека такое імя, яно вызначае яго характар. Некаторыя такія імёны не заўсёды падабаюцца людзям, але яны павінны цешыцца, што іх так ахрысцілі. Гэтыя імёны напамінаюць іхнім уласнікам хто яны і адкуль яны. Гэта таксама наша спадчына.

На маю думку, людзі, якія маюць старадаўнія імёны, больш чым іншыя абавязаны захоўваць традыцыі і старацца, каб іх пазнавалі ўсе навокал. Проста, яны ўсе павінны стаць творчымі людзьмі!

Падумайце самі: вам больш цікавае імя Патрык ці Пракоп? З каторым з іх вы хацелі б пазнаёміцца ў першую чаргу?

Оля Конюх, *Небасклон*,
Гімназія № 7 у Беластоку

Вам усё трэба падаць на талерцы!

Гутарка з ***Яўгенам Вапам****, галоўным рэдактарам „Нівы" і Радыё Рацыя.*

Небасклон: *— Хто з'яўляецца Вашым любімым фельетаністам?*

Яўген Вапа: — Маім любімым фельетаністам, калі гаварыць пра беларускую прастору, з'яўляецца Сакрат Яновіч. Люблю таксама Віктара Сазонава, бо ён майстар слова, які ўмее жартаваць і пісаць усур'ёз. Калі мова пра фельетаністаў, якія друкуюць у польскіх газетах, дык тут хачу назваць Рафала Зямкевіча.

Небасклон: *— Мы ведаем, што Вы таксама пішаце фельетоны пра Беларусь. Ці ў Вас былі непрыемныя паслядоўнасці з-за адважнага пункту гледжання?*

ЯВ: — Так, 23 мая г.г. пры ўездзе ў Рэспубліку Беларусь мне паставілі пячатку з забаронай уезду на тэрыторыю Беларусі. Ну і, вядома, раней беларускія сродкі масавай інфармацыі па мне тапталі.

Небасклон: *— Якая праца дае Вам больш задавальнення — у газеце, ці на радыё?*

ЯВ: — Напэўна асалодай штодзённай працы з'яўляецца праца над тэкстамі ў газеце. У „Ніве" працуюць людзі многіх талентаў. Гэта выключны калектыў творчых людзей сярод нашай беларускай меншасці ў Польшчы. Кожны дзень я магу ў іх нечаму навучыцца.

Небасклон: *— Пяройдзем цяпер да школы і вучняў. Ці цяперашняя моладзь розніцца ад той, калі Вы былі настаўнікам у ліцэі?*

ЯВ: — Моладзь мае цяпер многа дапаможнікаў, карыстаецца новымі тэхналогіямі. Пры шырокім доступе да ўсяго, што добрае, яны не ўмеюць гэтым карыстацца. Сучасная моладзь навучана, каб ўсё ім падаваць на талерцы. Гэта пакаленне „загладжаных" людзей. У іх да ўсяго менш ахвоты. Адрознівае іх таксама пашана да людзей, прыроды, свету...

Небасклон: *— Ці Вы хочаце, каб Ваша дачка пайшла ў Вашы сляды?*

ЯВ: — Я думаю, што яна сама будзе вырашаць у які бок ёй ісці. Я лічу, што яна ўмее пісаць.

Небасклон: *— А ці Вы правяраеце сшыткі Даркі?*

ЯВ: — Калі я бачу, што нешта дрэннае дзеецца, тады правяраю. Часам справа сама вырашаецца. Я пытаю пра дамашнія задачы, тады яна кажа: „Іду рабіць урокі!".

Небасклон: *— Якое значэнне мае літаратурны конкурс „Дэбют"?*

ЯВ: — Ён менавіта на тое, каб людзі паспрабавалі сваіх сіл у літаратуры. Гэта для многіх здольных людзей шанц развіваць свае зацікаўленні.

Небасклон: *— Ці Вам як галоўнаму рэдактару „Нівы" прыемна, калі моладзь піша ў „Зорку"?*

ЯВ: — Вельмі прыемна, бо хоць мы старэем, то адначасна маладзеем. Для нас, людзей старэйшага пакалення, важна, калі вас цікавяць беларускія тэмы, калі вы пішаце. Гэты досвед для вас бясцэнны. Бо калі чалавек уцягнецца да пісання з маладога ўзросту, гэта напэўна дапаможа стаць яму журналістам. Не кожнаму пісаць проста. Адны патрабуюць больш працы, іншыя менш. Таксама тыя, у каго ўсё добра ідзе, хутка могуць страціць здольнасць пісання. Тут няма правіла, проста, трэба працаваць

Небасклон: *— Куды Вы паедзеце на канікулы?*

ЯВ: — Оооо! Пакуль не ведаю. Напэўна хачу паехаць у наваколле Сямятыч, да брата, наведаць ваколіцы Мельніка, пахадзіць берагам Буга.

Апрацавала **Уля Беразавец,**
Небасклон, Гімназія ў Нарве

Уладзімір Караткевіч

Чортаў скарб

(працяг з 30 н-ра)

А Янка дааpаў клін і пайшоў дахаты. І толькі там успомніў, што нештачка ў падпечку свяціла і чорт пра нейкі скарб казаў.

Пачалі капаць у падпеччы і — на табе — выкапалі вялізны закураны казан з золатам і чырвонцамі. Нібы жар, разлілося святло па хаце.

Так ужо свяціла, так паліла, так пякло, што ўсе аж распранацца пачалі.

Чорт пасля таго ў моцныя маразы ўсё ж прыходзіў. Толькі прасіў кошку ў камору выкідаць. Капусту Янку варыў і дзяцей калыхаў. З таго часу і пайшла прыказка, што шчаслівому і чорт дзяцей калыша.

А на той чортаў скарб паставіў Янка сабе і ўсяму наваколлю новыя хаты, свірны, адрыны, новыя стайні. Сады пасадзіў, млын паставіў.

Ва ўсіх сялян па сорак сыноў ды дачок, па сорак коней ды валоў і ўсе хаты, як звон. І ў кожнай хаце на акне, на сонейку, кошык. А ў кожным кошыку кошка. І ў кожнай кошкі па шасцёра кацянят. Во шчасце дык шчасце!

І таму, калі ты жывеш шчасна і радасна, ніколі не дражні мядзведзя ў звярынцы і не кідай у кошку не тое што каменем, а нават мяккай грудкай зямлі. Бо гэта ж яны зрабілі калісьці так, што табе добра. Ды і наогул ні ў каго не кідай і нікога не дражні.

Тады ўсім будзе хораша на гэтай прыгожай зямлі, што ляжыць трошкі бліжэй Сонца і трошкі далей ад Месяца. Людзі будуць працаваць, кошкі будуць вуркатаць, а мядзведзі насіць табе і ўсім іншым дзецям салодкія ступы...

Тупу-тупу-тупу.

Музыка з кайфам

Bom dia Беларусь!

Bom dia на партугальскай мове абазначае „добры дзень"! Гэтымі словамі ўжо свабодна карыстаецца Андрэа Джавана. Гэтая бразілька пацвярджае, што ў сённяшнім свеце няма межаў, што калі хочаш — можаш здзяйсняць і што ў інтэрнэце ёсць амаль усё, у тым ліку нечаканыя магчымасці. А калі вы там не знайшлі таго, што цікавае — проста чытайце „Музыку з кайфам".

Андрэу Джавану беларускія слухачы пазналі пасля таго, як змясціла ў інтэрнэт-канале *youtube* два відэаролікі з выкананнем беларускіх песень. Першым беларускім творам, які вывучыла, была „Купаліначка" групы „Харлі", а пасля прыйшлі наступныя. Дапамог добра вам вядомы партал „Тузін гітоў", які аказваецца сапраўды вялікай і цікавай прасторай для пошуку беларускай музыкі. Самае цікавае ў гэтай падзеі аднак тое, што ў свеце ёсць людзі, якім неабавязкова цікавы англамоўны поп, а калі не поп дык альтэрнатыва, але надалей англамоўная. Можаце сказаць дзе партугальская, а дзе беларуская мова! Тут адказ прыносіць самая Андрэа ў адным з інтэрв'ю: „Як я зразумела, беларускія фанемы больш лёгкія для размаўляючых па-партугальску за фанемы англійскай мовы". Можа тады пачаць вучыцца партугальскай мове, каб зразумець, што і наша вартасная (гэта заўвага для тых, якія сумняваюцца ў каштоўнасці роднай мовы).

http://www.yo-u-tu-be.com/watch?v=BKvR_NIM3xQ

Прыклад Андрэі паказвае, што можна жыць на другім канцы свету, а ўсё ж такі быць у сярэдзіне падзей! Колькі з вас хацела б выступіць з Лявонам Вольскім ці Зміцерам Вайцюшкевічам? Андрэа, мабыць, зможа выступіць з імі ў Менску, бо ў падзяцы за прамоцыю беларускай музыкі ў свеце, за адвагу і рашучасць яе беларускія сябры і фанаты беларускай музыкі збіраюцца наладзіць супольны канцэрт у сталіцы Беларусі. Праўда, калі б нехта з Польшчы запусціў у інтэрнэт падобнае, праўдападобна не знайшоў бы такой увагі (запісы Андрэі глядзела больш за 20 тысяч інтэрнэт-карыстальнікаў). Вядома, Бразілія — экзатычная краіна, а Польшча — шэра-бурая суседка. У гэтай астатняй ведаюць расейскую мову, а на ўсходзе — беларускую, тады не выклік праспяваць па-беларуску. Цяжка з гэтым не пагадзіцца, але ці гэта Андрэа, ці Джон, ці Шарл, ці Сташэк, а нават Мбэвэ, заўсёды найважнейшая адданасць справе, пасія, прыемнасць. Тады можа быць усё!

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 31



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклеенымі кантрольнымі талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 27:

Муха, грыва, душ, ом, парк, ластаўка, ар, брат. Мода, лук, шпак, Ас, гурт, каша, вочка, там, арт.

Крыж у Падгараднянцы

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Вёскі і падвёскі

Дамураты здаюцца быць сімвалічным межавым знакам паміж Усходам і Захадам. У тапаграфічным плане вуліца гэтай вёскі зламаная пад прамым вуглом, быццам два яе бакі былі сабе перпендыкулярнымі, быццам уяўлялі сабою два розныя пачаткі. Адзін канец вёскі выходзіць у заходнім напрамку на шашу між Сухаволяй і Штабінам, другі — на поўнач, на палі ў бок ракі Бобры. Амаль на кожным панадворку стаіць крыж з польскім тэкстам — гэта вонкавая пазнака тамашніх вясковых душ. А вось пра глыбінную духовую канатацыю мясцовых вяскоўцаў паведамляе ніўскі тэкст Ганны Кандрацюк гадовай даўнасці („Ніва" № 29 ад 18 ліпеня 2010 г.). Залом вуліцы, што выходзіць на поўнач, з аднаго боку закончаны помнікам у памяць двух братоў, замардаваных у 1945 годзе *przez wrogów ojczyzny*, які быццам паказвае мясцовую наяўнасць розных адносін да гэтай айчыны. Амаль насупраць гэтага помніка іншы помнік — аброслы дрэвамі бетонны бункер Лініі Молатава, будаванай семдзесят гадоў таму быццам для размежавання Усходу ад Захаду. У сеціве знаходзіцца іншая цікавінка, персанальная: „Фомин, Владимир Владимирович (25.I.1909—27.XII.1979) Сов. химик, чл.-кор. АН СССР (с 1964). Р. в с. Дамураты (ныне ПНР). Окончил Ин-т социального воспитания в Нежине (1931). До 1938 преподавал в средних школах на Украине, во Владивостоке и Казахстане, в 1938-1941 — в Московском пед. ин-те, в 1943-1948 — в Московском ун-те, с 1948 — в Н.-и. ин-те неорг. матлов и одновременно проф. Московского ун-та. Осн. работы относятся к химии и технологии радиоактивных элем...".

Аўтар манаграфіі пра Сухавольскую гміну Ян Гузоўскі так пісаў у 2000 годзе: „Nazwa wsi Domuraty pochodzi od nazwiska człowieka — szlachcica, który zamieszkiwał niegdyś w Domuratach, posiadał hutę żelaza i nazywał się Domurat. Na pobliskich łąkach kopano rudę darniową, zwożono do pobudowanego tu pieca i wytapiano węglem drzewnym żelazo". Асабовую назву *Domarad* этымалагічны слоўнік Брукнера падказвае асацыяваць з дамаседам. У апісанні Хадароўскай парафіі з 1784 года ксёндз Ян Данішэўскі так апісаў вёску: «Domurady wieś, rudniki mieszkają, (...) soszniki robią...».

Каля паўкіламетра за паўночным канцом Дамурат, на расхадных палявых дарогах стаіць бетонны крыж са следам стральбы па ім. Паставілі яго мясцовыя набожныя людзі ў 1938 годзе, каб „urodzaje ziemskie dać i one w całości zachować racył prosimy Cię Panie". І нейкі ж бязбожнік таксама паставіў на ім след свайго капыта. Ад гэтага крыжа прывабны від даліны Бобры з панарамай супрацьлеглага Штабіна. Кругом рупліва аброблены палі з кукурузай і трыцікале, каля Дамурат пасвіцца вялікі статак кароў.

Пад згаданым раней адрэзкам шашы з Сухаволі ў Штабін сёння дрыжыць зямля пад коламі камунікацый з Прыбалтыкі на поўдзень. З нейкай апаскай знаходжу палявую дарогу ад гэтай шашы ў напрамку Гараднянкі; вядзе яна ўзлескамі і палямі, сярод якіх бачныя і аблагі. За Гараднянкай былы школьны будынак, у якім цяпер крама і мінігатэль.

Ян Гузоўскі: „Miejscowa ludność obu wsi Horodnianka i Podhorodnianka uzasadnienie tych nazw tłumaczy w sposób następujący. Niegdyś między tymi wsiami był dwór szlachecki — własność Sztuteryńskiego. (...) Wieś Horodnianka była z jednej strony na ogrodach, a Podhorodnianka z drugiej strony na tych ogrodach. Ogród w miejscowym narzeczu brzmi 'harod', a więc jedna wieś i druga swym położeniem stanowiły dla dworu jakby ogrodzenie. Stąd powstała nazwa wsi Horodnianka. Podhorodnianka znaczy położona pod Horodnianką. (...) Jest jeszcze inna wersja. Niewątpliwie ten dwór szlachecki stanowił jakby gród obronny położony niegdyś na pograniczu, a właściciel dworu był dowódcą straży granicznej jako horodniczy, stąd pochodzi nazwa wsi Horodnianka. (...) Obok tej wsi przepływa rzeczka o nazwie Horodnianka, jest lewym dopływem Biebrzy. Przepływa ona także obok wsi Domuraty i tamtejsza ludność nazywa ją Domuratką".

У пачатку Падгараднянкі чыгунны крыж з 1882 года на фоне буйнага бэзу. Крыху далей размаляваная ў жоўты колер паветка, быццам там быў аўтобусны прыпынак. Але гэтая паветка з'яўляецца іншага роду прыпынкам, своеасаблівым дэмаграфічным паказальнікам на тэрыторыі Сухавольскай гміны — гэта паветка для чакаючых гімбуса дзетак; відаць у тамашніх вёсках іх столькі, што вартыя такога захаду.

Крыж за Дамуратамі з 1938 г.

Калі я прыглядаўся да аднаго з крыжоў па падгараднянскай вуліцы, падышоў да мяне мужчына сярэдняга ўзросту, вельмі гаваркі. Пра цэментны крыж, з 1943 года, сказаў ён, што прывезены ён быў сюды з могілак, калі там паставілі навейшы. І пра жвіровую вуліцу ў сваёй вёсцы сказаў ён: гэта павятовая дарога, таму на ёй такі насціл. Калісь людзі пазбіралі камяні з-пад бульбакапалкі і паклалі іх пад маставую, якую прысыпалі жвірам. А асфальт пакладзены на некаторых навакольных гмінных дарогах, таму цяпер з'явілася на іх і больш *łapiduchów*. Сам ён выйшаў да мяне ад грунтоўна рамантаванай хаты, у якой акурат мянялі *podręby*. Хату, якой апошняя жыхарка памерла год назад, купіў жыхар Беластока, якога жонка з забобранскага Чарнева, дзе іхняя хата згарэла. І паспяшаў ён да работы...

Зараз за Падгараднянкай, так як і за Дамуратамі, бетонная «точка» Лініі Молатава, побач яе некалькі кароў пад кляновым цяньком. Крыху далей, за кукурузным палеткам, у жыце, чарговы такі ж сувенір ад савецкага тут побыту.

Дарога вядзе ў чарговую вёску Жаклі. Ян Гузоўскі: «Niegdyś tu zaścianek szlachecki, którego właścicielem był Rucki. To uroczysko zostało rozbudowane tak, że dziś liczy 7 domów. Wieś Żakle jeszcze nie tak dawno była położona tak, że miała wejście tylko od strony Podhorodnianki, a z drugiej wyjścia nie było, tak jak w sieci rybackiej 'żak', stosowanej tu do łowienia ryb w rzece Biebrzy. Aby wyjechać z drugiej strony należało przejechać przez posesję gospodarza. W tej wsi nie mieszkali i nie mieszkają ludzie o nazwisku Żak. Nazwa wsi pochodzi od nazwy uroczyska, a zaś nazwa uroczyska może mieć związek z siecią rybacką żakiem zwaną». Ды і цяпер той другі выхад праходзіць цераз неабгароджаны панадворак... Дарога гэтая вядзе ў вёску Цёмнае побач абшырнага зялёнага тытунёвага мора...

Ян Гузоўскі: «Wieś ta położona w pobliżu bagnistego brzegu rzeki Biebrzy. Niegdyś otoczona liściastymi drzewami, lasami które zaciemniały okolice. (...) Mieszkańcy wsi Ciemne minionych pokoleń jeździli odrabiać pańszczyznę do majątku w Bobrze Wielkiej koło Nowego Dworu. Wieś Ciemne była własnością Rutkowskiego, właściciela majątku Rutkowszczyzna, który wydając córkę za mąż do Bobry Wielkiej wieś Ciemne oddał jej w wiano».

На расхадных дарогах перад Руткоўшчынай вялікая драўляная капліца з 1810 года. Сама Руткоўшчына калісь называлася Паддвуглямі, ад назвы суседняй мясцовасці, перайменаванай пасля за прозвішчам ейнага ўласніка Руткоўскага. Мяне, аднак, асабліва цікавілі тыя Двуглы, па той прычыне, што там калісь мела быць буйная рачная прыстань.

Дарога з Руткоўшчыны ў Двуглы вядзе праз лес. На акраіне лесу два крыжы: стары высокі драўляны без даты і каменны з 1952 года. Далей пабачыў я чалавека, які зняў са слупкаў шнурок, што перагароджваў маю дарогу ў бок Бобры. Паспяшаў я да яго. Чалавек аказаўся гаваркім.

Пацікавіўся ён спачатку, ці я бачыў праваслаўныя могілкі. Здзівіла мяне, адкуль там яны. Аказваецца, што гэта брацкая магіла загінуўшых у 1915 годзе расійскіх салдат. А зараз перад намі паказаў ён іншую некраполію — нямецкія могілкі таго ж перыяду; адлеглыя яны ад Бобры каля ста метраў. Паводле майго інфарматара на расійскай некраполіі пакоіцца семдзесят пяць чалавек, а на нямецкай дзвесце пяцьдзесят. Могілкі былі абгароджаны з уваходам Польшчы ў Еўрасаюз, апякуюцца імі ўлады Сухавольскай гміны. На маё пытанне, ці нехта з Германіі цікавіўся нямецкімі могілкамі, мой субяседнік адказаў адмоўна. Магілы тыя паявіліся ў лютым 1915 года, калі нямецкае камандаванне правяло г.зв. мазурскую аперацыю, адкідаючы расійскія войскі з мазурскіх азёр на Нёман. Магчыма, што ў Двуглах хацелі яны па замерзлай Бобры прарваць расійскі фронт між крэпасцямі Асавец і Гродна і абысці апошняе...

Падышлі мы і на бераг Бобры. Даведаўся я, што яшчэ ў міжваенны час была там каменная маставая, з якой сплаўлялі драўніну, а сама рака падыходзіла да невысокага грудка, зараз засеянага жытам; цяпер яна аддаленая ад таго грудка каля пятнаццаці метраў. Археолагі знаходзілі рэшткі чоўнаў ды манеты з XVI стагоддзя. Пацікавіўся я таксама, ці была там пракладзена дарога на другі бок Бобры, бо на мапе відаць яе з паўночнага боку ракі. Дарогу былі пабудавалі саветы ў 1940 годзе, і тры драўляныя масты на трох рукавах ракі, але што сталася з мастамі пасля мой суразмоўца змаўчаў. Сказаў ён мне затое, што згаданы мною драўляны крыж паставіў ягоны дзед у 1905 годзе. І што зараз Двуглы перасталі быць салэцтвам, тут асталося пяць хат і толькі яшчэ ксёндз перад калядой згадвае пра гэту мясцовасць. Ян Гузоўскі: «... z początku był tu jeden zaścianek szlachecki, którego właścicielem był Kulbacki. Potem gospodarstwo podzielono pomiędzy rodzeństwo i do córki przyszedł w przystępy Wirkowski. Potomkowie tych rodów szlacheckich żyją tam do dziś. To były dwa gospodarstwa, z ros. dwa ugła. Przed pierwszą wojną światową a jeszcze wcześniej była tu duża składnica drzewa (dęby, jodły), które spławiano rzeką Biebrzą». Магчыма, што праз гэтую прыстань паплыла ў свет і значная частка заходняй акраіны колішняй Навадворскай пушчы...

Вяртаючыся назад, пабачыў я і тыя правочаныя мною раней расійскія могілкі. Яны каля кіламетра ад Бобры, за расхаднымі лясными дарогамі, таму і не заўважыў я іх, засяродзіўшы сваю ўвагу на выбары аднаго з гэтых разгалінаванняў. Зайшоў я яшчэ і ў Руткоўшчыну, мяркуючы выйсці адтуль у бок Падастраўка. Аднак у гэтай вёскі толькі адзін канец — з боку Цёмнага; з другога канца выхаду няма — амаль так як у Жаклях. Перад тупіком стаяла слупавая драўляная капліца, пра век якой я спытаў маладога чалавека, што паказаўся з суседняга панадворка, аднак даты ўзнікнення святыні ён не ведаў, адно паведаміў мяне, што раней на ёй быў ківот, які разляцеўся ад старасці. Даведнік пра крыжы ў Руткоўшчыне згадвае пра некалькі з іх з XIX стагоддзя. Старых святынь у Сухавольскай гміне так многа, што складана адназначна іх параўноўваць з апісаннямі.

МЕТАФІЗІЧНЫ ДАЛЯГЛЯД

Размова з Ігарам Бабковым, паэтам і філосафам з Мінска, удзельнікам „Еўрапейскай агоры” ў Сейнах з нагоды сотых угодкаў Чэслава Мілаша

Фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

„Ніва”: — ***Што Вы сёння напісалі б у лісце Чэславу Мілашу?***

Ігар Бабкоў: — Тое, што я хацеў напісаць, я ўжо напісаў. Аднак, адзінае, што так крыху мыляла, гэта тое, што гэта ліст нябожчыку, і ясна, хто яго туды перадасць. І ўвогуле пісаць лісты нябожчыку гэта небяспечны занятак. Калі патрапіш потым туды, можна сустрэцца і атрымаць выспятак... Гэта, канешне, такі паўжарт. Але сама фома напачатку падалася мне такой дзіўнаватай. Потым я зразумеў, што гэта значна лепш, бо яна дазваляе і на такую лепшую экзістэнцыйную інтанацыю, дазваляе гаварыць нейкія асабістыя рэчы, а не проста звяртацца з такімі паліткарэктнымі і маласэнсоўнымі словамі пра дыялог, сяброўства, et cetera. Ёсць іх вельмі многа, і яны ўжо не значаць практычна нічога. І як аказалася, што такая магчымасць унутрыэкзістэнцыйнай інтанацыі ёсць, то тады ліст пачаў пісацца. І тады я прыгадаў сваю сустрэчу з Мілашам, якая сапраўды адбылася, на Віграх, на сярэднееўрапейскім форуме культуры, дзякуючы КшыштафуЧыжэўскаму і Сакрату Яновічу, які ўзяў мяне за шкірку і пасадзіў перад Мілашам і я мусіў задаваць яму пытанні. Ну, дыктафон не працаваў, я рабіў выгляд, што ў мяне ёсць важная задача запісаць ягоныя адказы. Насамрэч мне хацелася яму сказаць пра тое, што адбывалася ў Беларусі ў гэты час. Беларусь сапраўды пачынала сніць сны абсалютна нечаканыя, і ў гэтых снах яна адкрывала для сябе і Вялікае Княства, і Літву, паказвала цэлы сусвет. Мы яшчэ сутыкаліся, паказваючы гэтае права на спадчыну, гэта тое, што мы — нябачныя, а ўсё бачым і быццам бы хацелі ўдзельнічаць у гэтым дыялогу, але самі выступаем як такія прывіды, як здані. То адзіны вобраз Беларусі, які ў той час быў, акрамя гэтых малочных рэкаў і лясоў, і ўсяго такога — гэта вясковая, калгасная, яшчэ не дыктатура, але вось такая краіна, бедная і няшчасная, якая імкнецца кудысьці ўзбіцца. У той жа час у Мінску была зусім іншая генерацыя, я б сказаў нават залішне нахабная ў сваіх амбіцыях, і культуралагічных, і творчых. І гэтая генерацыя праз Дубаўца аднаўляла і рабіла віленскую „Нашу ніву”, рабіла шмат якія іншыя рэчы, якія былі не ўбачаныя і не пачутыя нашымі суседзямі ні на Украіне, ні ў Польшчы, ні ў Літве. І калі той Кшыштаф Чыжэўскі выдаў нарэшце беларускі нумар „Краснагруды” і мы ў Мінску атрымалі гэты нумар, са здзіўленнем пабачылі той вобраз Беларусі, які ёсць у нармальнага, цудоўнага, арыентаванага на дыялог паляка. Такога вобразу Беларусі ў нас не было. Прытым мы сябравалі з Кшыштафам дзесяцігоддзямі. Самае дзіўнае, мабыць — загадка, якая прымусіла задумацца, што тут штосьці не так з раскладкай дыялогу. Я думаю, што фармальныя рэчы — зрабіць сядзібу ці яшчэ раз сабрацца — нічога не вырашаюць, пакуль мы не пачнем задумвацца і не пачнем думаць, пакуль мы паўтараем такія прыгожыя паліткарэктныя словы, як „дыялог”, накладкі „культура”, але — не думаем.

— ***Вы напісалі, што „Беларусь станавілася праектам і ўтопіяй. А можа нават чыстай метафізікай”. Што гэта значыць?***

— Праектам — ясна. Гэта пра тое казаў сёння прафесар Зыгмунт Баўман [аб ягоным выступленні ў рамках „Еўрапейскай агоры” мы пісалі тры тыдні таму — М. Х.]. То ёсць, усе сутыкаюцца з мадэрнасцю і спрабуюць увайсці ў мадэрнасць. А мадэрнасць гэта заўсёды ўяўленне самога сябе ў якасці праекта. Любая нацыя паўстае як праект. Беларусь як бы доўгі час бачыла і разумела ды думала пра сябе ў тэрмінах натуральных — „родная старонка”, „не пакідайце ж мовы нашай беларускай”, „адраджэнне”, — гэта быў немадэрны праект. Гэта быў праект... не ведаю як яго назваць. Вось у канцы васьмідзесятых — пачатку дзевяностых адбыўся пералом і Беларусь пераўтварылася ў праект. Паколькі пры гэтым яна знаходзіла сябе ў сітуацыі двоекультуры — як мінімум бікультурнасць беларуска-расійская была — свядомасць Беларусі мае двайную культурнасць у сабе, то ёсць, няма ніякіх каланізатараў знешніх, якія, скажам, жывуць у Сухарава ці іншым мікрараёне; каланізатар знаходзіцца ўнутры самой беларускай свядомасці. А паколькі ў канцы васьмідзесятых, пачатку дзевяностых усё гэта раптам стала ясна, і стала ясна, што тыя людзі, якія ўляпаліся ў беларускі праект, пайшлі туды пасля досведу еўрапейскай культуры, філасофіі, і проста зрабіць яшчэ адну нацыю такую як і ўсе — для нас было замала тады. Хацелася чагосьці іншага. І таму Беларусь непазбежна патрапляла ў штосьці, што можна назваць метафізічным далягляадам. Мы шукалі не проста нейкіх такіх фізічных сэнсаў, якія могуць увасабляцца як „свая дзяржава”, шукалі чагосьці, што будзе легітымізаваць і апраўдваць гэтае фізічнае існаванне. Дзеля чаго ўсё гэта рабілася?

— ***А Вы згодны з гэтым што гаворыць Андрэй Хадановіч, што „Мілаш — наш?”***

— Гэта, уласна кажучы, я напісаў у некралогу, калі Мілаш памёр, і „Наша ніва” папрасіла адклікнуцца. Вось там былі гэтыя словы: „Мілаш быў наш”. Проста, Мілаш — ён фантастычна сугучны быў у сваёй асноўнай эмоцыі з тым, што адбывалася ў Мінску ў канцы васьмідзесятых — пачатку дзевяностых. Мілаш — метафізічны паэт, Мілаш наш не таму, што ён наш па крыві ці паходжанні, ці зблізку, а таму што ён зразумелы і патрапляе ў далягляд нашых чаканняў.

— ***Што гэта значыць: „Беларусь — без культурнага алібі”?***

— Без культурнага алібі — метафара, канешне. Паколькі ў нас агора філасафаў, сацыёлагаў, у сацыёлагаў ёсць такі папулярны тэрмін П’ера Бурд’е „сімвалічны капітал”. Значыць, кожная нацыя, кожны творца мае тое, што мы можам назваць сімвалічным капіталам. Гэта не грашовы капітал, а той капітал, які сатканы з чаканняў, то ёсць світа, якая робіць пэўную нацыянальную культуру альбо творцу. Дык вось Беларусь, беларуская культура мае калі не нулявы ўзровень гэтага сімвалічнага капіталу, то мабыць нават адмоўны. То ёсць Беларусь не прыдумана сваімі суседзямі, не прыдумана іншымі еўрапейскімі культурамі ў якасці чагосьці вартага. Таму што сімвалічны капітал і вось гэтае самае культурнае алібі гэта не тое, што сама нацыя думае пра сябе, ці сам творца думае пра сябе, а тое, што паўстае якраз з гэтага поля чакання. А што такое беларуская культура, нават для самых найбліжэйшых суседзяў — палякаў, літоўцаў, украінцаў, не кажу ўжо пра расіянаў, — нішто.

— ***А ці Вы пагаджаецеся з тэзісам, што можна было б прыдумаць Беларусь, толькі для таго, каб яе любіць?***

— Прыдумаць? Так, так. На гэтых прасторах беларускі праект мусіў паўстаць і дзеля таго, каб на іх штосьці варта было любіць. Таму што інакш гэта проста прастора, аб’ект для каланізацыі. Калі не існуе беларускага праекта, то гэтыя тэрыторыі проста раздзёртыя між самымі разнастайнымі каланізатарамі. Яны далей выступаюць у якасці чыстага аб’екта. Я б сказаў нават больш радыкальна, што сам беларускі праект пачынаўся насуперак мадэрнасці, як бунт супроць мадэрнасці. Гэта бунт тутэйшай прасторы, угрунтаванай у сваёй лакальнасці, тутэйшасці, супроць таго што адбываецца, гэта першая маніфестацыя нейкай ідэнтычнасці. Памятаеце, калі пытаюць гэтага няшчаснага дзядка: „хто ты?”, ён кажа што не паляк і не маскаль, а „сам я тутэйшы, а край наш забраны”. Такая просценькая гісторыя, этнаграфічная, а насамрэч гэта паказвае, наколькі сустрэча такая праўдзівая. Мадэрнасць на гэтых тэрыторыях нараджае руіны, мадэрнасць у такой агрэсіўнай каланізацыйнай форме. І беларускі праект гэта спроба проста бараніцца. Тое, што была гэта абарона тутэйшай прасторы супроць каланізацыйных аргэсіўных мадэрных праектаў, — ну гэта вось такая канфігурацыя, якая доўжылася ўсё дваццатае стагоддзе, якая пераламілася, канешне, ужо на пераломе дзевяностых — двухтысячных гадоў.

— ***Як Вы думаеце, адназначна, чаму для Мілаша, як сцвярджаў, — Беларусь была загадкай?***

— Па вялікім рахунку, канешне, гэтае пытанне — для Мілаша. Бо ён гэта сфармуляваў, і ён ужо ясна не адкажа. Ён тое напісаў у „Радзіннай Еўропе”, працягнуў далей, пра паланізацыю і русіфікацыю. І загадка для яго была хутчэй у тым, чаму ўвогуле Беларусь застаецца. Нягледзячы на такія агрэсіўныя сутыкненні — усё яшчэ штосьці там застаецца. Хаця для мяне, шчыра сказаўшы, загадка: чаму Беларусь для Мілаша была загадкай. Калі мы прыгадаем зноў жа тыя трыццатыя гады і ягонае віленскае студэнцтва, работу, вершы маладога паэта, — Мілаш робіць кар’еру класічнага левага інтэлектуала, і ён сам не раз пра гэта прыгадваў, з сімпатыяй да нацыянальных рухаў. Беларускі нацыянальны рух у II Рэчы Паспалітай — гэта адзін з самых фантастычных, паспяховых — адна Рабоча-сялянска грамада — двухсоттысячная, абмены заключаных, Тарашкевіч перакладвае „Пана Тадэвуша” ў польскай турме, Бяроза-Картузская, канцлагер, дзе адсядзелі ўсе заходнебеларускія... — чаму ён гэтага не бачыў? Ён гэтага не бачыць, бо гэта немагчыма. Можа так, як часам кпяць з абмежаванняў сярэдняга класа — дробная буржуазія, якая таксама не хоча бачыць некаторых рэчаў. Мабыць, тое паходжанне, пра якое Мілаш пісаў — шляхецкае, зямянскае — яно не дазваляла бачыць, таму што Беларусь была пагрозай. Ужо ў трыццатыя гады для II Рэчы Паспалітай беларускі праект гэта адназначна праект левы, камуністычны, і ён адназначна агрэсіўны, які скарыстоўвае іншага каланізатара дзеля таго, каб адкруціць усё назад.

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Беларускі фэст у Чаромсе

Чарамшане не могуць наракаць на брак культурных мерапрыемстваў. У календары мясцовага Асяродка культуры запісана шмат цыклічных імпрэзаў, якія прыносяць жыхарам пасёлка многа пацехі і задавальнення. Да такіх належаць Навагодняя ёлка з карнавальнай забавай, Вечар калядак, святкаванні Міжнароднага дня жанчын, Дня маці, Міжнароднага дня дзіцяці, Фольклавыя сустрэчы „З вясковага панадворка", Дзень сеніёра ды шмат іншых. Калісьці БГКТ арганізавала тут народныя фэсты, але ад нейкага часу кантакты гэтай арганізацыі з лакальнай грамадскасцю парваліся. І вось пасля перапынку ГП БГКТ супольна з мясцовым ГАКам рашыла арганізаваць фэст — традыцыйны, народны. Абвесткі былі распаўсюджаны ў наваколлі. Прыманкай да ўдзелу ў імпрэзе былі, зразумела, мастацкія калектывы, якія мелі выступіць на прыспасобленай на ўлонні натуры сцэне: „Рэха пушчы" з Гайнаўкі, „Ас" з Беластока, „Куранты" з Бельска, „Згодныя макі" з Райска, „Прымакі" з Гарадка ды „Церніца" з Беларусі.

У нядзелю 17 ліпеня стаяла цудоўнае цёплае надвор'е. Ідэальны час для забавы пад адкрытым небам. Калі я заязджаў на пляцоўку некалькі мінут да 18-й, усе месцы на лаўках былі заняты. Шмат людзей гуртавалася на тратуары за агароджай. З клуба выносілі складныя крэслы і прыстаўлялі да лавак. Такою нагодай і я пакарыстаўся. Уладкаваўся з боку, непадалёк сцэны.

Афіцыйную частку мерапрыемства пачалі Ян Сычэўскі — старшыня ГП БГКТ і войт гміны Юры Шыкула. Гэты апошні прывітаў гасцей, у тым ліку намесніка генеральнага дырэктара Культурнага цэнтра Беларусі ў Беластоку Дзяніса Вялічку, старшыню ГП БГКТ і заадно раднага Падляшскага сеймікa Яна Сычэўскага, удзельнікаў мастацкіх калектываў ды шматлікую публіку. Затым узяў голас Ян Сычэўскі, які сказаў: „Сённяшняе мерапрыемства арганізавалі супольна з Гмінным асяродкам культуры пры фінансавай дапамозе Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі ды Культурнага цэнтра Беларусі ў Беластоку. Каб не было ўспамогі спонсараў, не было б імпрэзы. Са свайго боку, — адзначыў старшыня Ян Сычэўскі, — пахадайнічалі за падборам такіх калектываў, каб задаволіць чаромхаўскую публіку. Затым — вясёлай забавы, паважаныя госці!".

Канцэрт пачаўся кампазіцыяй „Наша песня" ў выкананні гайнаўскага гурту „Рэха пушчы" (мастацкі кіраўнік Аліна Негярэвіч). Пад яе кіраўніцтвам выступілі „Згодныя макі" і „Куранты". Кожны калектыў выканаў па чатыры песні. Паколькі ў рэпертуары „Рэха пушчы" і „Згодных макаў" былі народныя, беларускія песні, дык „Куранты" запрэзентавалі сучасныя кампазіцыі. Музыку да тэкстаў Віктара Шведа „Валянціна" і „Першы снег" напісала Аліна Негярэвіч. Яна таксама зрабіла музычную апрацоўку да тэксту Янкі Купалы „Вясна". Канцэрт згаданых гуртоў быў горача ўспрыняты публікай.

Людзей прыбывала. Пляцоўка была запоўнена шматлюдным натоўпам: дарослымі, моладдзю ды дзецюкамі. Для гэтых апошніх фэст быў сапраўднай „фрайдай". Задбалі пра гэта купцы, якіх вітрыны ларкоў манілі смакоццямі ды рознага віду каляровымі цацкамі. Малечы куплялі надзіманыя цацкі і гулялі па пляцоўцы. Аматары піва ласаваліся ахаладжальным духмяным напоем пад парасонамі. Удзельнікі фэсту маглі паглядзець выстаўку гафтаваных макатак ды сурвэтак Галіны Бірыцкай з Плянты і карцін Мікалая Яноўскага са Старога Беразова. Можна было таксама купіць кампактныя дыскі выступаючых гуртоў.

Канцэрт працягваўся. Выступаў „Ас". Гэтага гурту не трэба было рэкамендаваць чарамшанам. Ён даволі вядомы ў чыгуначным наваколлі. Прэзентаваныя творы „Песня пра нашых бацькоў", „Ой, Гандзя" ды „Залатое калечка" былі ўспрыняты бурнымі апладысментамі. Вельмі сардэчна прывітала публіка калектыў „Церніца" з Беларусі. „Радзіма мая Беларусь", „Распрагайце хлопцы коней", „Ты казала..." ці „Чарка на пасашок" — гэта некаторыя песні з даволі багатага рэпертуару калектыву, які госці запрэзентавалі чарамшанам. Варта адзначыць, што танцавальная група шыкарна запрэзентавалася на сцэне і заахвоціла да супольнай забавы смельчакоў з публікі. Сярод удзельнікаў імпрэзы знаходзіўся ветэран вайны жыхар Дабрывады Аляксандар Рач-

працяг ☞ 11

Адным з тых чыннікаў, што характарызуюць павагу нацыі да самой сабе, з'яўляецца стаўленне да сваёй культуры. Менавіта культура кожнага народа разам з гісторыяй і мовай — гэта тое, што падкрэслівае яго аўтэнтычнасць і адрознасць ад іншых. Культура не падзяляе народаў, а надае свету людзей разнастайнасць у добрым сэнсе. Цікава, што нават узаемапранікненне культур не знішчае культур-складнікаў, а ўтварае побач з імі нешта новае, нечаканае.

На жаль, адносін да беларускай культуры ў беларусаў не назавеш прыхільнымі, хутчэй абыякавымі. Зразумела, разнастайныя фестывалі, нават фальклорныя, гэта добра, але яны не адраджаюць і не стымулююць павагі да спрадвечных правіл паводзін, якія цягам стагоддзяў выпрацоўвалі нашы продкі, каб жыць у згодзе са сваімі блізкімі і суседзямі. А гэта менавіта тое, што дае магчымасць супрацьстаяць таму падзенню маралі, якое можна бачыць між іншым і ў асобе цяперашняга беларускага правіцеля.

Канешне, далёка не ўсе згодныя з такім станам рэчаў, і магчыма таму ствараюцца разнастайныя культурніцкія арганізацыі. Адным з прыкладаў можна назваць Беларускі фонд культуры (БФК), сайт якога месціцца ў інтэрнэце па адрасе **www.bfk.by**.

Будову сайта цяжка назваць прафесійнай, бо спярша цяжка зразумець, што гэта сайт грамадскай арганізацыі, а не „Краязнаўчай газеты", назва якой падаецца вялікімі літарамі ў версе выяўлення. Толькі размешчаны ніжэй артыкул „Пра нас" распавядае пра БФК. „Асноўныя задачы БФК: садзеянне ўдзелу розных групаў насельніцтва ў культурным будаўніцтве, выкарыстанню іх творчых намаганняў і матэрыяльных магчымасцяў; аказвае маральную, матэрыяльную і прававую падтрымку ініцыятывам і пачынанням грамадскасці, якія накіраваныя на памнажэнне культурнай спадчыны, захаванне і выкарыстанне народных традыцый, развіццю краязнаўства, прафесійнай і аматарскай творчасці і г.д.; аказвае дапамогу моладзі ў творчым росце; адшуканню і вяртанню твораў мастацтва, архіўных матэрыялаў, іншых помнікаў гісторыі і культуры, якія знаходзяцца па-за межамі краіны; развіццю міжнародных сувязяў і абменаў", — так акрэсліваюць свае функцыі актывісты культурніцкай арганізацыі, якая між іншым і выдае ад 2003 года вышэйзгаданую „Краязнаўчую газету".

Газета, калі зазірнуць у рубрыку „Навіны", цяпер перажывае далёка не лепшыя часы існавання. Менавіта таму кіраўніцтва БФК звяртаецца да ўсіх чытачоў з заклікам аб матэрыяльнай падтрымцы. „Эканамічны крызіс, у якім апынулася Беларусь, паставіў нашую газету перад праблемай: быць ці не быць ёй — адзінай краязнаўчай у нашай краіне. Дзевяты год існавання газеты стаў сапраўды катастрафічным (значна падаражалі папера і друк, іншыя матэрыялы, неабходныя для падрыхтоўкі выпуску газеты). Штат рэдакцыі працуе не за грошы (тое, што атрымоўваюць, грашыма назваць не магу — сорамна). Яны працуюць за ідэю, краязнаўчую ідэю", — сумна распавядае Уладзімір Гілеп, галоўны рэдактар газеты і старшыня арганізацыі.

Магчыма, знойдуцца людзі, якія падтрымаюць гаротных беларускіх краязнаўцаў. І можа з гэтага пачне змяняцца стаўленне беларусаў да сваёй культурнай спадчыны, а краязнаўчых перыядычных выданняў стане больш чым адно.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ ы

Святло Жыровіч

Сярод беларускіх рэлігійных святыняў жыровіцкі асяродак займае асаблівае месца. За многія стагоддзі тысячы людзей звярталіся па заступніцтва да іконы Жыровіцкай Божай Маці. І напэўна яго знаходзілі. Справа гэта глыбока духоўная, таму не кожны захоча падзяліцца сваім досведам у такой інтымна-асабістай сферы. Калі ўсё добра, людзі рэдка задумваюцца пра вечнае. Калі ж здараецца бяда, ці агортвае самотнасць, роспач, безнадзейнасць у нейкай жыццёвай сітуацыі, шукаюць найбліжэйшы шлях да Бога. А потым, калі ўсё спакваля наладжваецца, зноў забываемся пра галоўнае.

У XV стагоддзі пастушкі мясцовага магната Аляксандра Солтана знайшлі ў лесе маленькі абразок на грушцы-дзічцы, які ззяў у прыцемку. Далей гісторыя распавядае, як Солтан паклаў дзівосную выяву на камені-яшме ў куфар, а калі хацеў паказаць гасцям, абраз знік. Праз некаторы час пастухі знайшлі іконку на тым жа самым месцы ў лесе. Солтан успрыняў такую праяву як знак звыш і пастанавіў заснаваць тут храм. Першасная драўляная царква згарэла ў 1520 годзе. Спярша меркавалася, што загінуў і цудоўны абраз. Аднак неўзабаве дзеці знайшлі яго на камяні. З гэтага часу сюды пачынаюцца паломніцтвы. На месцы другога з'яўлення іконы была пабудавана царква — з адпаведнай назвай — Яўленская. Да слова, той легендарны камень дагэтуль ляжыць у ёй і служыць прастолам. Крыху пазней паўстае мужчынскі Жыровіцкі манастыр. Яго развіццю спрыяў сам канцлер Вялікага Княства Леў Сапега, які некаторы час быў уладальнікам Жыровіч. Слава пра санктуарый і цудатворную ікону хутка разышлася па ўсёй дзяржаве. Штогод мясціну наведвалі каля 10 тысяч паломнікаў розных веравызнанняў. Абраз Жыровіцкай Божай Маці дагэтуль шануецца асноўнымі хрысціянскімі канфесіямі Беларусі. У сярэднявеччы і пазней сюды прыязджалі манархі і магнаты, якія рабілі шчодрыя ахвяраванні. „Біяграфія" асяродка была складанай, як і ўся наша гісторыя. Сёння ж няма сэнсу спрачацца, хто зрабіў большы ўнёсак у развіццё Жыровіцкага кляштара — праваслаўныя ці ўніяты. Галоўнае — што гэта наша агульная спадчына, супольны духовы здабытак.

У савецкі час жыровіцкая святыня, як і многія іншыя рэлігійныя асяродкі, была занядбаная. Памятаю, калі першы раз трапіў я сюды, то з жыватворнай крыніцы тырчэла звычайная труба, а наўкола была гразь і валялася смецце. Зараз крыніца ўпарадкавана і дагледжана, побач з ёй пастаўлена каплічка, створана купальня, у якую можна патрапіць у кожную пару года. Манастыр і храмы таксама адроджаны. На тэрыторыі комплексу ажно некалькі культавых будынкаў розных памераў і прызначэння. Асабліва хораша глядзіцца Крыжаўзвіжанская царква-кальварыя на некаторым узвышшы. Дрэвы, якія растуць наўкола, усе схіліліся да яе. Такое можна пабачыць яшчэ хіба толькі ў Грабарцы на Беласточчыне. А яшчэ Жыровічы сёння для многіх — гэта сустрэчы з інакам Мікалаем. Беларускі паэт і філосаф Алег Бембель ужо даўно пакінуў сталіцу і знайшоў свой прытулак у абіцелі. Асабіста для мяне кожная, нават зусім кароткая, гутарка з ім вельмі дарагая.

Нашы людзі часцяком выбіраюцца ў далёкія падарожжы, замежныя вандроўкі і нават рэлігійныя пілігрымкі. Аднак, многія з іх ніколі не былі ў Міры, Навагрудку, Нясвіжы. А багатая гісторыя, дзівосныя здабыткі культуры зусім побач. Так і са святлом Жыровіч, якое можа адкрыцца кожнаму, хто шчыра гэтага захоча.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Беларускія калектывы ў Сямятычах

„Церніца” з Мінска

У сонечную нядзелю ў амфітэатры ў Сямятычах прайшоў канцэрт беларускіх гуртоў пад назвай „Жывем разам — Сямятычы горадам многіх культур”. Імпрэзу арганізавалі Галоўнае праўленне БГКТ і Сямятыцкі асяродак культуры. Мэтай падзеі было паказанне, што людзі, якія адрозніваюцца культурай, узростам, мовай могуць разам суіснаваць.

Выступілі гурты „Рэха пушчы” з Гайнаўкі, „Згодныя макі” з Райска, „Ас” з Беластоку, „Omorfos” з Сямятыч, „Куранты” з Бельска-Падляшскага, „Калінка” з Беластока, „Прымакі” з Міхалова і „Церніца” з Менска. Усе гурты заспявалі выдатна, але публіка найбольш чакала „Аса” ды „Прымакоў”, якія вельмі папулярныя на Падляшшы.

Падчас імпрэзы можна было пачуць падляшскія хары. Мужчынскі хор „Куранты” спяваў не толькі па-беларуску, але і па-расейску. Жаночы ансамбль „Згодныя макі” чароўна спяваў традыцыйныя беларускія песні. Моцным галасам гурту „Рэха пушчы” акампаніраваў акардэон. Усімі трыма ансамблямі дырыжыравала Аліна Негяревіч. Музыканты насілі традыцыйную беларускую вопратку. Хлопцы мелі чорныя боты, льняныя кашулі, саламяныя капелюшы, а дзяўчаты — аздобныя чырвона-белыя сукенкі і квяцістыя вянкі. Шкада, што апрача галоўных зорак імпрэзы („Ас”, „Прымакі”, „Церніца”) іншыя гурты былі на сцэне коратка. Звычайна гурт спяваў толькі 3-4 песні.

Самы энергічны канцэрт даў ансамбль „Церніца”. Артысты падчас свайго выступу прыгожа танцавалі, нават запрасілі да супольнага танца гледачоў. Можна было адчуць сябе як на сапраўднай сялянскай забаве ў беларускай вёсцы. Мне асабіста іх выступ найбольш спадабаўся. На канец імпрэзы выступілі вельмі чаканыя „Прымакі”. Яны завязалі добры кантакт з публікай, шмат жартавалі.

Паглядзеўшы на радасныя твары гледачоў магу сказаць, што імпрэза была ўдалая. На забаву прыйшло каля 250 жыхароў Сямятыч. Каля сцэны можна было набыць каляровыя цацкі для дзяцей, мёд, ласункі ды рукадзелле мясцовых мастакоў — абрусы, ручнікі, сурвэткі. Імпрэза мела чыста сямейны характар. Чакаю наступнай імпрэзы „Жывем разам”.

Т. К.

ЗАПРАШЭННЕ

10 ☞ працяг

кевіч. Калі пра баявы шлях абаронцы Масквы, салдата арміі маршала Жукава расказаў вядучы Юрка Астапчук, беларускія артысты прысвяцілі яму песню „Кацюша”.

Атракцыёнам імпрэзы аказаўся канцэрт „Прымакоў”. Яго лідар і заадно вядучы фэсту дасканала забаўляў жартамі і весяліў публіку.

— Не было б „Прымакоў”, каб не было так цудоўнай публікі, — сказаў Юрка Астапчук. — Для вас ад калектыву нізкі паклон! Запрашаем таксама на 6 жніўня на „Прымацкую бяседу” ў Міхалова, якую арганізуем з нагоды 15-годдзя існаваня калектыву. Прыязджайце. Будзем разам святкаваць...

Не стану пералічваць рэпертуару, які запрэзентаваў калектыў на фэсце. „Ты і я навекі” — для закаханых, „І ты прымак, і я прымак” ці „Пажаданні прымакоў” гэта некаторыя песні, якія пакарылі шматлюдную публіку. А калі гурт пакідаў сцэну, натоўп грымеў гучным „біс”. Такое ж „біс” паўтаралася тройчы. Канчаткова „Прымакі” развіталіся з чарамшанамі песняй „Пажаданні ад прымакоў”. „Шчасця людзям усёй зямлі...” — паняслося рэхам па наваколлі ў цудоўны летні вечар. Бо і ўся імпрэза была сапраўды цудоўная. Ды не скончылася яна канцэртам мастацкіх калектываў. Доўжылася далёка за поўнач на танцавальнай забаве з гуртом „Атут” з Сямятыч.

Адгаданка

1			2						3				4							5			6	7						8
	9				10				11				12			13												14		
	15					16											17		18					19		20		21		
			22	23		24							25				26				27									
									28			29	30					31	32				33		34					

1. Уладзімір, беларускі паэт, які заклікае гаварыць праўду, 2. конскі ласунак, 3. ручны млын, 4. багаты квартал Лондана з перадавой футбольнай камандай, 5. першае імя беластоцкага гетмана, 6. ганаровае месца ў хаце за сталом пад абразамі, 7. антонім куплі, 8. ільдзіна на рацэ, 9. бацька дванаццаці праўнукаў Аўраама, 10. муж Евы, 11. беларуская зберагальная ўстанова ў Гайнаўцы, 12. дзевятая літара грэчаскага алфавіта, 13. жонка фальклорнага камара, 14. дзяржава Іосіфа Броза, 15. журавель крыху інакш, 16. падача рэзкага голасу, 17. дзяржава з трызубам у гербе, 18. эфіопскі вяльможа, 19. балгарскі ўладар, 20. мяжуе з Дамініканай, 21. упрыгожанае навагодняе дрэва, 22. майстэрства тэатральнага танца, 23. мільён грамаў, 24. выспа Іштар і Афрадыты, 25. горад між Варшавай і Кельцамі, 26. усходняя страва з рысам і баранінай, 27. французскі гараднічы, 28. партнёрка каня, 29. рух рукі або галавы ў дадатак да размовы, 30. сярэдневяковы ваяка, 31. з аглоблямі, 32. звязка бярвення для сплаву па вадзе, 33. без носа ў сямі нянек, 34. касіў канюшыну.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — страфа Янкі Юхнаўца. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 26 нумара

Берэт, бубен, Дзева, дзевер, дзея, дым, жаба, жонка, іней, лаўка, музей, Нант, папа, Піна, пуд, Сыс, чаўнок, шыпенне.

Рашэнне: **Будзе вечна ў калядным сне ўсім уздадзена па патрэбе — кожнай рыбіне па вадзе, кожнай птушыне па небе.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

31.07 — 06.08

(22.03. — 20.04.) Не будзеш гнацца за прыгодай і моцнымі ўражаннямі. Купіш новыя замкі, пераглянеш прапановы страхоўкі, адкладзеш пару злотаў на горшую гадзіну. 1-5.08. будзеш адораны вялікай інтуіцыяй і празорлівасцю. Адчуеш момант на дзеянне і ашарашыш праціўніка ўдачлівасцю. Народжаныя 5-9.04. могуць перажыць невялікае любоўнае расчараванне.

(21.04. — 21.05.) Распірае цябе энергія, ты — кароль жыцця і жарсцяў (не пераборш з гулянкамі!). Супер атмасфера ў сям'і (аж да 22.08.!). У першай палове жніўня ціха ў кар'еры, але і без параз. Дзіўнае супадзенне можа адмяніць тваё жыццё (вядома, на лепшае!). Ад 5.08. (да 9.08.) будзеш самаўпэўнены і засяроджаны; абяцанні здзейсняцца. Ды з 3 (да 7.08.) можа папсавацца твой імідж (незалежна ад усяго — трымай слова!). Пільнуй свайго пазваночніка.

(22.05. — 22.06.) Вялікія змены. Аж да 26.08. будзеш прымушаны памяняць свае планы. 3-26.08. будзе шмат замяшання ў тваім жыцці. Не нервуйся. Хоць 3-7.08. будзеш дзейнічаць хутка, паспяхова і шмат можаш здабыць. Але ж і немалыя выдаткі цябе чакаюць (гэта хутчэй інвестыцыя — мо ў новы камп'ютар, мо ў свой выгляд).

(23.06. — 23.07.) Марс змабілізуе цябе да высілку, не толькі фізічнага. Дынаміка і бавітасць. Увесь месяц будзеш рэзвы і малады. 1-5.08. апынешся ў адпаведным часе і месцы. Спрабуеш чагосьці, чаго ніколі яшчэ не рабіў.

(24.07. — 23.08.) 3-7.08. будзеш разважлівы, трывалы. Людзі будуць лаяльныя, падарожжы павучальныя. Дзве першыя дэкады вельмі мілая атмасфера на працы. Ды ў першыя дні жніўня не дайся спакусіць на „непаўторную” нагоду; ахвота хутка і лёгка ўзбагацець можа табе шмат каштаваць!

(24.08. — 23.09.) Сцішыся, аддыхайся, спакойна рабі сезонныя парадкі ў сваім жыцці. Адпачывай усю першую палову месяца, добра карміся (пад канец жніўня будзеш мець вагу аб якой марыш). З 3 да 26.08. могуць прытрапіцца турботы пры розных вызначэннях; не спадзявайся шмат ад абяцанняў. З 6.08. не бяры пазык!

(24.09. — 23.10.) З 3.08. (да 7.08.) цяжка будзе цябе задаволіць, бо ўсё будзеш хацець больш. Не будзь нахабным і лёгкадумным, каб не быць смешным. Могуць адчыніцца перад табою дагэтуль закрытыя дзверы. Не бойся ставіць усяго на адну карту!

(24.10. — 22.11.) Збірайся ў дарогу! Чакае цябе мноства незабыўных уражанняў, а можа нават новае каханне! А калі застанешся на рабоце, таксама не будзе гэта страчаны час — заззяеш талентам і ведамі. З 5.08. будзеш спачувальны, добры, усіх схочаш узяць пад свае крылы.

(23.11. — 22.12.) Здабыткі ва ўсіх сферах жыцця. Твой козыр — кемлівасць, інтэлігентнасць, краса. Ты — на хвалі! Ніхто табе ні ў чым не адмовіць. Толькі будзь вельмі асцярожным, старайся быць сціплым і памяркоўным, не біся з ветракамі. 3-7.08. не дзяры носа і пільнуй грошай, бо страты могуць быць большыя чым прадчуваеш.

(23.12. — 20.01.) Завяршы ўсе старыя справы, а пасля займіся найважнейшым. На працы магчымыя змены, дык будзь гатовы. 3-7.08. пакажаш адказнасць і працавітасць, ніхто з табою не зраўняецца. Венера гарантуе табе добры выгляд і папулярнасць.

(21.01. — 19.02.) Цудоўныя хвіліны з партнёрам. У сужонствах першыя дзве дэкады жніўня — поўная ідылія. 2-6.08. пакажаш сваё правадырства. Знойдзеш выхад з найцяжэйшага становішча і пацягнеш за сабою іншых.

(20.02. — 21.03.) У жніўні шмат спраў пачне складвацца так як хочаш. Кончыш рамонты, перасяленні (разлічвай на падтрымку сяброў). Будзеш упэўнены ў сабе, ва ўласных дзеяннях і непахіснай інтуіцыі. Найбольшую прыемнасць будзеш мець ад... працы! З 6.08. (да 10.08.) цікуюць непаразуменні і абман.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

БУРАВОЕ

На XXII Фестываль музыкі маладой Беларусі „Басовішча” (22-24 ліпеня) сёлета сабралася недзе каля трох тысяч людзей.

Тэкст і фота
Міры ЛУКШЫ

— „Басовішча як заўсёды буравое”, — заўважыў адзін з уючаных „намётам” і „наплечнікам” удзельнікаў яшчэ ў рэйсавым аўтобусе, што ехаў з Беластока ў Гарадок. А дармовыя аўтобусы паўпустыя з аўтавакзала („аўтобусны палац”) два дні вазілі ўдзельнікаў непасрэдна амаль пад паляну на ўрочышчы Барык у Валілах-Станцыі. На XXII Фестываль музыкі маладой Беларусі „Басовішча” (22-24 ліпеня) сёлета сабралася недзе каля трох тысяч людзей. Ды дзе ж іх пералічыш — на палатачным полі мне, як удзельніцы „басаў” ад самага пачатку здалося, што гэтых „намётаў” менш чым заўсёды, але не толькі там стаялі палаткі. Шмат удзельнікаў рассыпалася па ўсім мястэчку і Валілах-Станцыі. Заняткаў было таксама шмат апрача слухання музыкі. Варта было павучыцца на майстар-класах белага спеву (Аня Фёнік і Юлька Харытанюк), малявання трафарэтаў (вёў іх вядомы мульты-мастак Войцех Каранкевіч), паглядзець у кіназале „Тутака” фільмы — між іншым „Чалавек з аб’ектывам” Дзігі Вертава (1929), ваенную драму „Ідзі і глядзі”, „Прыгоды Бураціна”, „Дзікае паляванне караля Стаха”, „Акупацыя. Містэрыя”. Пасля поспеху трапічнага пляжа пасярод паляны ўзнік „цэнтр Байка-нур”. Хоць „не адной каўбасой жыве чалавек”, як адзначыў на самым пачатку Аркадзік Васілюк, але і паўгалодным (адно „становішча” з ежай) лепш слухаецца вострай музыкі. „«Басовішча» ставіць на шматслоевасць і разнароднасць”, — адзначалася, і да ўдзелу ў XXII выпуску фэсту былі запрошаны м.інш. і прадстаўнікі польскай сцэны: праект „РУТА” (Рух утопіі, трансэндэнцыі, анархіі / Рэакцыйная унія тэрарыстычна-артыстычная), што „адпраўляецца на ўсход, каб супольна з майстрамі традыцыйнай музыкі з-за Буга, змагарамі за свабоду і захаванне айчынных традыцый, заснаваць бескампрамісную, звышнацыянальную Унію і вярнуць да жыцця забытыя або мэтанакіравана нішчаныя ў час СССР, архаічныя песні з Беларусі, Расіі, Украіны, заяўляючы супраціў адносна касты паноў і абвяшчаючы дагаранне феадальнай няволі”. Наста Някрасава дапоўніла шэрагі гурту „РУТА” і супольна з імі выканала некалькі архаічных песень. Хедлайнерамі, апрача „РУТА”, сталі групы „Нейра-Дзюбель”, „IQ48”, „BN”, „Yellow Brick Road” і „ДахаБраха” разам з „Порт Манэ”, „Tymon&Transistors”, пераможца мінулагодняга „Басовішча” — „Акутэ” і лаўрэат „Exist-M”. „IQ48” — гульня відаў з пагранічча рока, гіп-гопа, ска і фанкі (цяпер толькі па-беларуску). Сцэна для такіх волатаў не павінна быць „кавалкам бетону”, як адзначыла Кася Кузьміч, арганізатарка фэсту, а такая, як на нармальных еўрапейскіх фестывалях — модульная. Песні ды выканаўцы — як і гледчы — ад аматараў панка да металу праз фольк на найлепшым сусветным узроўні. „Нейра-Дзюбель” (1991) іграе ў розных стылях — ад панка да гардкора, праз рэге і блюз, тэксты па-беларуску і паруску (вакал і тэксты Аляксандра Кулінковіча) — класіка беларускага „цяжкага іграння” (за свой альбом „Stasi” атрымаў галоўную ўзнагароду ў Рок-Каранацыі 2008). „ДахаБраха” (2004) — дзейнічае пры Кіеўскім цэнтры мастацтва Дакг, заснаваў яго авангардны тэатральны рэжысёр Уладзіслаў Троіцкі, чэрпае з украінскага і сусветнага фальклору, выступае з мадэрным беларускім інструментальным гутром „Порт Манэ” — тут „этна-хаос у чыстым значэнні”. У інструментарыі „ДахаБраха” мае індыйскую таблю, гуцульскі бубен, будысцкі гонг, віяланчэль, маракасы, расійскія трашчоткі, джамба, жалейку, трамбон, бугай, дарбуку. А „Акутэ” сваю музыку называюць „дыск-дакаданс”. Затое беластоцкі „Бетон” (пяць дзевак і двух зухаў) — „псіхадэлік-дыска-панк”. „Exist-M” — „спалучэнне металу і электронікі, якой у Беларусі яшчэ не было”. „Зніч” — рок-метал родам з паганшчыны (15-годдзе!). „Yellow Brick Road” — іграючы індзі-рок. Ну і „Zero-85” — „які немагчыма скаласіфікаваць ці падпарадкаваць канкрэтнаму стылю” — гаражны *noise system* на гітару, бас, бубны і вакал, ад „пастгранджавага рока да архаічнага этна”. Што б гэта не значыла.

Журы конкурснай часткі ў складзе Міхал Аўчарак (журналіст III праграмы Польскага радыё, вядучы перадачы „Strefa rokendrola wolna od angola”), Таццяна Заміроўская і Багуслаў Каспярук з 22 залічаных да конкурсу гуртоў абрала была шэсць, якія выступілі ў першы дзень фэсту: гэта „Гаротніца”, „Yellow Power” „Вурай”, „Авіяс” і „Кашлаты вог”. У конкурсе выступіў яшэ „Амарока” — лаўрэат другой узнагароды фестывалю „Менфест” (хлопцы файна дзыгалі). Стрэфа „ад анголя вольнай” не была.

Перамог „Yellow Power”, адным голасам перад „Гаротніцай”. Ёй варта хіба даць прыз за назву! Асабліва вылучалася вакалістка, зусім па іміджу не „гаротная”, з гурту „Рэха”, адкуль і вядучы „Басовішча” афрабеларус — музыкант, паэт, мастак Андрусь Такінданг, вядучы праграмы „Беларуская мова” на тэлеканале ОНТ, які з тэлеэкрана вучыць беларусаў беларускай мове.

фота www.racyja.com

ISSN 0546-1960